WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

5 ЖНІЎНЯ 2010 г. ЧАЦВЕР № 151 (26759)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.




## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЗАПАТРАБАВАЎ АД ДЗЯРЖОРГАНАЎ ПРЫНЯЦЬ УСЕ МЕРЫ ДЛЯ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ПАЖАРНАЙ БЯСПЕКІ

«Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад урада, губернатараў, МНС, МУС і іншых дзяржаўных органаў узмацніць кантроль за пажарнай бяспекай у краіне, мабілізаваць для гэтага ўсе існуючыя рэсурсы, прыняць вычарпальныя меры па прадухіленні пажараў і іншых надзвычайных сітуацый прыроднага характару, выкліканых анамальным тэмпературным рэжымам», — сказалі ў прэс-службе.

Кіраўнік дзяржавы таксама даручыў прэм'ер-міністру Сяргею Сідорскаму абмеркаваць з яго расійскім калегам усе віды магчымай дапамогі, якую Беларусь можа і гатова аказаць Расійскай Федэрацыі ў тушэнні лясных пажараў на яе тэрыторыі, а таксама аднаўленні страчанага ў агні жылля.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## БЕЛАРУСЬ ДАПАМОЖА РАСІІ АДНАЎЛЯЦЬ ПАЦЯРПЕЛАЕ Ў ВЫНІКУ ПАЖАРАЎ ЖЫЛЛЁ

**Беларусь акажа дапамогу Расіі ў тушэнні пажараў і аднаўленні жылля. Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада, 4 жніўня адбылася тэлефонная размова прэм'ер-міністра Беларусі Сяргея Сідорскага са старшынёй урада Расіі Уладзімірам Пуціным.**

Кіраўнік беларускага ўрада агучыў прапановы беларускага боку аб аказанні дапамогі Расійскай Федэрацыі ў ліквідацыі надзвычайных сітуацый, звязаных з ляснымі пажарамі, а таксама аднаўленні страчанага ў агні жылля.

Прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін выказаў удзячнасць кіраўніцтву Беларусі за прапанаваную дапамогу ў складанай сітуацыі.

Як растлумачылі ў прэс-службе, беларускі бок прапанаваў падтрымку па двух напрамках. Па-першае, нягледзячы на існуючую ў нашай рэспубліцы няпростую пажаранебяспечную сітуацыю, Беларусь накіруе ў Расію 20 машын, укамплектаваных самымі сучаснымі сродкамі пажаратушэння, а таксама 2 верталёты МНС. Па-другое, Беларусь мае багаты вопыт будаўніцтва жылля ў вёсцы, ёсць адпрацаваныя праекты тыпавых жылых домікаў. У існуючай сітуацыі беларускі бок гатовы прыпыніць выкананне сваіх праграм у гэтай галіне будаўніцтва і максімальна аказаць дапамогу Расіі па ўзвядзенні неабходнай колькасці дамоў пад ключ да надыходу халадоў. Так, ужо ў самы бліжэйшы час беларускія спецыялісты пачнуць будаўніцтва 100 такіх дамоў. У далейшым пры неабходнасці іх колькасць можа быць павялічана.

## НА ДАПАМОГУ Ў ТУШЭННІ ПАЖАРАЎ У РАЗАНСКАЙ ВОБЛАСЦІ РАСІІ БЕЛАРУСЬ НАКІРАВАЛА 20 АЎТАЦЫСТЭРНАЎ, 150 ПАЖАРНЫХ І ВЕРТАЛЁТ

— Практычна завершана фарміраванне зводнага атрада, які будзе аказваць дапамогу выратавальнікам Расіі пры тушэнні лясных і тарфяных пажараў, — расказаў **начальнік рэспубліканскага цэнтра кіравання і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі МНС Беларусі Аляксей ВАРАБ'ЁЎ**. — Да адпраўкі падрыхтавана 20 асноўных пажарных аўтамабіляў і 150 чалавек асабовага складу, які будзе забяспечаны неабходным абсталяваннем для пажаратушэння. Таксама для аказання дапамогі будзе задзейнічаны верталёт «МІ-8» авіяцыі МНС.

СТАР. 2

### Да 80 працэнтаў наступстваў урагану ліквідавана

Наступствы ўрагану, які абрынуўся на паўднёвы ўсход Беларусі 29 ліпеня, паступова ліквідуюцца. Паводле слоў **начальніка рэспубліканскага цэнтра кіравання і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі МНС Беларусі Аляксея ВАРАБ'ЁВА**, на сёння засталося аднавіць 16 сельгасбудынкаў і 2 жылыя дамы. «Ад 70 да 80 працэнтаў будынкаў, якія пацярпелі 29 ліпеня, на сёння адноўленыя».

**Ільля ЛАПАТО.**

Стыхія

# НЕ ДАЦЬ ЛЕСУ СТАЦЬ ПОПЕЛАМ!



**Пажарны дэсантнік з Полацка Сяргей Савуцін змагаецца з лясным пажарам. А ў Чачэрскім раёне ад вогненнай стыхіі авіяцыйнай аховай лесу выратавана вёска Гацкое. Спачатку дэсантнікі ўтрымлівалі гарэнне [illegible] уласнымі сіламі, потым падаспеў разлік МНС і агонь быў ліквідаваны. Гэтая інфармацыя паступіла ад дырэктара павятранай аховы лясоў «Беллесавія» пры Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях Аляксея Пшонкі. У гэтыя гарачыя дні асаблівай зонай патрулявання стала прыгранічная з Расіяй тэрыторыя. З-за працяглых высокіх тэмператур утварылася самая высокая — 4-й ступені пажаранебяспека. Лётны склад робіць у дзень да 16 вылетаў, налётваючы па 50—60 гадзін.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## У ВЫХАДНЫЯ МЕСЦАМІ ДА +39

**Як паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга ФЯДОТАВА, субтрапічная спякота затрымаецца на тэрыторыі Беларусі на працягу ўсяго тыдня.**

Паводле ўдакладненых прагнозаў, самымі спякотнымі днямі лета будуць пятніца, субота і нядзеля. Уначы ў гэтыя дні будзе вельмі душна, тэмпература будзе трымацца ў межах 18—23 градусаў. Удзень у пятніцу—суботу чакаецца 31—37, па паўднёвым усходзе — да 39 цяпла. У нядзелю ў заходняй палове чакаюцца навальнічныя дажджы, месцамі моцныя ліўні. Удзень — ад 24—28 градусаў на паўднёвым захадзе да 35—39 спякоты на паўночным усходзе.

У сувязі з анамальнай спякотай гідраметцэнтр аб'явіў штармавое папярэджанне па ўсіх рэгіёнах краіны. Чакаецца, што пасвяжэе толькі ў пачатку наступнага тыдня, калі дзённая тэмпература знізіцца да 24—31 градуса.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# СПЯКОТА «РАСПЕРАЗАЛАСЯ»! РАССЛАБЛЯЦЦА НЕЛЬГА

**Апошнія два дні на Гомельшчыне не было пажараў, якія могуць прынесці гаспадарцы краіны вялікія непрыемнасці. Аднак ніхто не расслабляецца, наадварот. Тым больш што з боку Добрушскага раёна, літаральна за два кіламетры ад мяжы з нашай краінай тлеюць тарфянікі. Дымны смурод стаіць ужо і на нашай тэрыторыі, але пакуль сітуацыя знаходзіцца пад кантролем. Для гэтага задзейнічаны ўсе магчымыя сілы МНС і не толькі.**

Для таго, каб папярэдзіць узнікненне пажараў у лясах і на тарфяніках, якія звычайна ўзнікаюць з-за неасцярожнага абыходжання з агнём, ва ўсіх раёнах Гомельшчыны ўведзена забарона на іх наведванне. Такое рашэнне прадыктавана пажаранебяспечнай сітуацыяй, якая пакуль працягвае ўскладняцца: пра дажджы можна толькі марыць. У цэнтры прапаганды і навучання Гомельскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях гавораць, што катэгарычная забарона на наведванне лесу будзе дзейнічаць, пакуль не нармалізуецца надвор'е. Акрамя таго, праводзяцца рэгулярныя рэйдавыя мерапрыемствы, ідзе пастаянны маніторынг пажаранебяспечнай сітуацыі. За торфапалямі вядзецца няспынны нагляд. Тым больш што сіноптыкі па-ранейшаму прагназуюць толькі спякоту. Задача, якую ставяць на ўсіх узроўнях кіраўнікі — прыкласці максімум намаганняў, каб звесці да мінімуму магчымыя наступствы стыхіі.

Цяпер усе падраздзяленні МНС і органаў унутраных спраў прыведзены ў рэжым павышанай гатоўнасці. Пастаянныя дзяжурствы нясуць службы прадпрыемстваў лясной гаспадаркі, меліярацыі і воднай гаспадаркі, арганізавана патруляванне тэрыторыі з паветра з мэтай ранняга знаходжання лясных і тарфяных пажараў. На асаблівы кантроль узята работа сістэмы энергазабеспячэння. Менавіта таму кіраўнікам гэтай галіны даручана забяспечыць павышаную гатоўнасць працы ва ўмовах надзвычайных сітуацый і правесці пазачарговыя агляды масланапоўненых апаратаў і абсталявання, а таксама ўзмацніць кантроль за станам трас высакавольтных ліній і забяспечыць гатоўнасць перасоўных аўтаномных крыніц сілкавання. Не сакрэт, што ў мінулым месяцы райцэнтр Акцябрскі застаўся без электраэнергіі — з-за спякоты адбылося адключэнне двух трансфарматараў. А ў Гомелі на трансфарматарнай падстанцыі «Заходняя» адбылося пашкоджанне высокачастотнага кандэнсатара сувязі, разбурэнне апорнай ізаляцыі і яе адключэнне — без электраэнергіі нядоўгі час заставалася каля 1200 дамоў прыватнага сектара і нават Гомельская гарадская клінічная бальніца №1.

Статыстыка ўзгаранняў у лесе і на тарфяніках пакуль некрытычная. З пачатку года на Гомельшчыне адбылося 155 лясных пажараў на плошчы 55 га — у 9 раёнах вобласці. Былі выпадкі ўзгаранняў кустоўя. Лакальныя ачагі ўзгаранняў тарфянікаў зафіксаваны ў Буда-Кашалёўскім, Жлобінскім, Добрушскім і Хойніцкім раёнах.

Між тым для Гомельшчыны застаецца актуальным аднаўленне аб'ектаў, якія былі пашкоджаны ў выніку парываў моцнага ветру 28 ліпеня. Па стане на 5 жніўня, без даху пакуль што застаюцца 94 грамадскія і прыватныя пабудовы ў 6 раёнах вобласці. У Буда-Кашалёўскім раёне стыхія знесла дах з дома жывёлагадоўлі ў СТК «Краснагорскі». У Кармянскім вецер прагуляўся па дахах фермаў і зернескладоў. У Рагачоўскім без шыферу засталіся цялятнікі і кароўнікі. Гарадскі дом культуры ў Жлобіне, які быў пакрыты адмысловай дахоўкай, пасля парываў моцнага ветру таксама застаўся з непакрытай «галавой». Яе, з-за адсутнасці матэрыялу, плануецца аднавіць толькі да пачатку лістапада. Асноўная ж большасць аб'ектаў — як прыватныя дамы, так і сельгаспабудовы — запланавана аднавіць куды хутчэй. Большасць — на гэтым ці наступным тыдні, а некаторыя, асабліва складаныя, — да канца жніўня.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ПАНЭЛЬНАЕ ЖЫЛЛЁ ДЛЯ «ЧАРГАВІКОЎ» ПАДАРАЖЭЕ НЕ БОЛЬШ ЧЫМ НА 10 ПРАЦЭНТАЎ

**Пра гэта ўчора паведаміў міністр архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандр СЕЛЯЗНЁЎ.**

Міністр адзначыў, што сёння кошт панельнага жылля для асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў складае, у залежнасці ад серыі дамоў і канкрэтнай сітуацыі, ад 500 да 650 долараў за квадратны метр агульнай плошчы. У цагляных дамах кошт жыллёвага метра можа дасягаць і 700 долараў. Далейшая дынаміка змянення цэнаў на такое жыллё будзе залежаць і ад кошту энергарэсурсаў, якія амаль напрамую звязаныя з сабекоштам цэменту і іншых будматэрыялаў. Вядома, што сёння тысяча «кубоў» прыроднага газу каштуе для будаўнічай галіны каля 250 долараў. Нягледзячы на істотнае падаражанне расійскага газу і нафты, спецыялісты Мінбудархітэктуры ўпэўненыя, што панэльнае жыллё самых масавых і танных серый для чаргавікоў падаражэе ў пачатку наступнага года не больш чым на 10 працэнтаў.

На ўсіх астатніх напрамках па лініі долевага і камерцыйнага будаўніцтва міністэрства сёння ўвогуле не прытрымлівае цэны, бо канчатковы кошт будаўніцтва квадратнага метра жылля рэгулюе непасрэдна рынак. У дакрызісны перыяд квадратны метр камерцыйнага жылля каштаваў нават больш за 2 тысячы долараў.

СТАР. 2

# ПРЫРОДНЫ САЛЯРЫЙ?

**— Сэрца не вытрымлівае ўсё гэта бачыць, — <u>начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Добрушскага райвыканкама Аляксандр АНТАНОВІЧ</u> паказвае палі з кукурузай, якую планавалася вырасціць на зерне. — Цяпер толькі на сілас пойдзе. А гэтае поле будзем убіраць у найбліжэйшыя гадзіны. Каб не загубіць тое, што засталося.**



Сапраўды, кукуруза ў полі стаіць амаль без прыкмет жыцця: лісце знізу рудое, зверху — хоць і зеленаватае, але быццам з крохкай паперы. Добрушскаму раёну «пашанцавала» сярод усіх на Гомельшчыне асабліва — дажджоў тут не бачылі з мая. Аляксандр Віктаравіч зрывае катах і паказвае. На ім — адзінкавыя зярняткі:

— Самі сітуацыю бачыце... Там, дзе нічога выправіць нельга, паскараем уборку кукурузы на сілас. Некаторыя ўчасткі пакуль трымаем пад кантролем: там, дзе ёсць невялікая надзея вырасціць на зерне. Сёння ўсё залежыць выключна ад умоў надвор'я. А ўсходы былі прыгожыя і па красавіку віды на ўраджай былі выключныя. Толькі вось цяпер глеба перасохла поўнасцю. Тэхнікі ў нас дастаткова, людзі гатовыя, кожны ведае свае задачы, што рабіць у такой сітуацыі. Таму прымаем рашэнні асобна па кожным полі. Між тым, у нас зараз 70 % дойнага статку ўтрымліваецца на зімовым рацыёне — на пашы карміцца няма чым.

Для Гомельшчыны гэтае лета — выключнае выпрабаванне надвор'ем. Уборка збожжа практычна закончылася — засталіся апошнія рэшткі на няўдобіцах. Каля 30 % ад пасеянага — ахвяра сонцу. Калі ж узгадаць, што і маразы забралі больш чым 20 % азімых, віды на ўраджай гомельскіх земляў прымушаюць сумаваць.

<u>**Начальнік аддзела Гомельскага абласнога цэнтра па гідраметэаралогіі і маніторынгу навакольнага асяроддзя Таццяна ЗАХАРАВА**</u> кажа, што аналагічнае надвор'е на паўднёвых землях Беларусі апошні раз было толькі ў 1936 і 1946 гадах. Вельмі спякотнымі былі таксама ліпень 2001-га і жнівень 2008-га. А 3 жніўня пабіты тэмпературны жнівеньскі рэкорд для Брагіна — 36,5 градуса. Што зусім парадаксальна сёлета, больш за ўсё пацярпелі паўночныя раёны вобласці, куды спякота прыйшла на два тыдні раней, чым на поўдзень, — падкрэслівае <u>**начальнік аддзела раслінаводства камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама Міхаіл КАЛЕСНІКАЎ**</u>:

— А для развіцця раслін і два тыдні — многа. Спякота справакавала ранняе паспяванне збожжавых на поўначы — гэта анамальная з'ява. Вегетацыйны перыяд закончыўся раней — яшчэ 2 тыдні расліны павінны былі расці, а спякота прыпыніла іх рост. Яна ж стэрылізавала пыльцу і колькасць зярнятак у коласе аказалася меншай, і маса зерня ўдвая меншая, чым летась. Колас стаў значна лягчэйшым. Сёлета і ўборка ішла раней у паўночных раёнах, а не паўднёвых — ападкаў на поўначы вобласці не было, а на Палессі ўсё ж зрэдку праходзілі дажджы. Пацярпелі больш за ўсё Добрушскі, Рагачоўскі, Чачэрскі, Жлобінскі, Буда-Кашалёўскі, Лоеўскі, Гомельскі раёны. У цэлым па зерневай групе недабор ураджаю складае да 30 % валавога збору.

Анамальна спякотнае надвор'е на тэрыторыі Гомельшчыны ўстанавілася практычна з пачатку чэрвеня. Дзённыя тэмпературы і дагэтуль не апускаюцца ніжэй за 30 градусаў, а ў асобных гаспадарках дасягаюць 39. Не радуюць нябёсы і дажджамі. Ападкі выпадалі на асобных тэрыторыях — і тое, максімальна — да 50 % нормы. Менавіта таму практычна па ўсіх культурах на Гомельшчыне — недабор ураджаю. Нават такая засухаўстойлівая, як кукуруза, не вытрымала экстрэмальных тэмператур. Катах не завязаўся, — тлумачыць начальнік аддзела раслінаводства камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама Міхаіл Калеснікаў:

— Адбылася стэрылізацыя пыльцы, таму і катах кукурузны не завязаўся. Працэнтаў 30-40 палёў кукурузы мы пачалі ўжо ўбіраць на сілас. Але ж сілас гэты будзе па энергетычнай каштоўнасці роўны траве. Мы сёння маем 11,7 цэнтнера кармавых адзінак травяністых кармоў на ўмоўную галаву. Але ў цэлым недабору па травяных кармах не будзе, бо мы за кошт кукурузы аб'ёмны паказчык выканаем. Больш за тое, мы зараз павялічваем пасевы пажніўных, паўкосных культур. Яны дадуць нам зялёную масу, якую можна выкарыстоўваць на нарыхтоўку кармоў.

Не вельмі аптымістычны малюнак і па іншых культурах, якім таксама не даспадобы тэмпературы паветра далёкіх паўднёвых краін. Калі па полі з бульбай ідзе камбайн, яго не бачна за воблакам пылу: зямля нібы распалены попел, а бацвіння практычна няма. Пакуль што пачалі капаць толькі раннюю бульбу і выбарачна, але зразумела, кажуць спецыялісты, што рост расліны даўно прыпыніўся. Між тым, пад кустоўем звычайна даволі шмат бульбін, праўда ўсе па памерах — не больш за пачак запалак.

Суцяшае толькі тое, што ведала гомельская зямля і значна горшыя сітуацыі. Напрыклад, у 1999 годзе вобласць сабрала толькі 437 тысяч тон збожжа. Сёлета ўжо намалацілі 725. Пакуль збяруцца рэшткі — будзе некалькі больш. Укаранёныя тэхналогіі і ў такім прыродным салярыі далі свой плён. Праўда, у планах Гомельшчыны было — вырасціць адзін мільён сто тысяч збожжа. Не атрымліваецца.

Прынамсі, сіноптыкі Гомельшчыне не абяцаюць жнівеньскай прахалоды. Начальнік аддзела Гомельскага абласнога цэнтра па гідраметэаралогіі і маніторынгу навакольнага асяроддзя Таццяна Захарава кажа, што наперадзе нас чакаюць рэкордныя жнівеньскія тэмпературы надвор'я: ёсць верагоднасць, што па максімуму яны перавысяць 39 градусаў...

**Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.**

*Добрушскі раён.*

Фотарэпартаж

# ХОЙНІКІ Ў РЫШТАВАННЯХ

**Хойнікі рыхтуюцца да Дня беларускага пісьменства. Няхай дапаможа ім добрае надвор'е і спрадвечная добразычлівасць палешукоў! У прадчуванні свята і моладзь, і старэйшае пакаленне, і, зразумела, дзеці. Тут, на зямлі чарнобыльскай катастрофы, да апошняга не верылі, што грандыёзнае свята можа завітаць і ў Хойнікі, такія далёкія ад сталіцы, ад колішніх гарадоў, дзе свята ўжо адшумела, і такія блізкія да небяспекі, да пакінутай небяспечнай тэрыторыі.**

СТАР. 6



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Тэхперсанал агульнаадукацыйнай школы №1 Хойнікаў рыхтуе гэты сімвалічны карабель для ўпрыгожвання фасаду ўстановы.**

РОЗГАЛАС — АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

## ПАПАЛІЎ СВОЙ ІРЖЭЎНІК РАЗАМ З ПАБУДОВАМІ СУСЕДЗЯЎ



У вёсцы Усохская Буда Добрушскага раёна 75-гадовы пенсіянер у такое спякотнае надвор'е вырашыў пазбавіцца ад іржэўніку на сваім участку. Пасля таго, як сухая трава выгарала, агонь перакінуўся на два суседнія домаўладанні. У адным выпадку агонь знішчыў дах цаглянага дома і хлеў з дошак, а ў другім — хлеў і лазню ля дачнага дома суседкі-гамяльчанкі. Папярэднія страты складаюць 6 мільёнаў рублёў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## РАБАЎНІКІ БАНКА АСУДЖАНЫ

**Асуджаны два бізнэсмены, якія абрабавалі аддзяленне аднаго з банкаў у пасёлку Копці недалёка ад Віцебска, а раней скралі 52 мільёны рублёў у жыхара Віцебска.**

Як паведаміла «Звяздзе» **старшы памочнік пракурора Віцебскай вобласці Ірына ТАЎТЫН**, рабаўнікі кіравалі прыватнымі фірмамі. Адзін з іх разам з жонкай выхоўваў 2-гадовае дзіця.

Першы іх сумесны крымінал — «рэкет» у дачыненні да жыхара абласнога цэнтра, які, у чым былі ўпэўненыя зладзеі, незаконна абменьваў валюту. Адзін з рабаўнікоў сачыў за «валютным прадпрымальнікам». Другі незаконна трапіў унутр ягонай машыны і «экспрапрыіраваў» 7 тысяч долараў, 158 тысяч расійскіх рублёў, больш за 1000 еўра, 21 мільён беларускіх рублёў.

Потым вырашылі «пажывіцца» ў банку, які працуе ў пасёлку Копці Віцебскага раёна. Каля пяці гадзін дня ў панчохах з прарэхамі для вачэй на галовах уварваліся ў памяшканне банка. Патрабавалі ў жанчыны-касіра выдаць грошы. Тая, як магла, супраціўлялася. Нават спрабавала ўключыць ахоўную сігналізацыю, каб па трывозе прыехала міліцыя. Але гэта заўважылі крымінальныя «кліенты». Жанчына атрымала ўдар кулаком у твар. Грошы прыйшлося выдаць. Усяго ў банку ўзялі 1200 еўра, 1270 долараў, больш за 20,4 тысячы расійскіх рублёў, больш за 10 мільёнаў беларускіх рублёў. Калі лічыць у эквіваленце, атрымаецца каля 20 мільёнаў беларускіх рублёў.

Адзін з рабаўнікоў асуджаны на 9 гадоў пазбаўлення волі, другі на 7 гадоў і 6 месяцаў (абодва — з канфіскацыяй маёмасці). Яны таксама абавязаны кампенсаваць пацярпеламу мужчыне скрадзеныя ў яго грошы, а яшчэ — маральную шкоду, нанесеную супрацоўніцы банка — 5 мільёнаў рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## НЕ СПЫТАЎ ДАЗВОЛУ НА 400 ГАСЦЕЙ НА ЎЛАСНЫ ДЗЕНЬ НАРОДЗІНАЎ

А трэба было. Як расказаў карэспандэнту «Звязды» начальнік Івацэвіцкага райаддзела ўнутраных спраў Аляксандр Гук, жыхар Івацэвічаў ператварыў уласны дзень нараджэння ў масавае мерапрыемства на беразе ракі Шчара. Пра гэта малады чалавек загадзя паведаміў ў інтэрнэце і запрасіў ахвотных. Іх і сабралася ў выхадны дзень 400 чалавек. З такой колькасцю людзей могуць праводзіцца толькі масавыя мерапрыемствы, на якія трэба атрымаць дазвол у мясцовым органе ўлады. Ну а паколькі такога дазволу не было, давялося віноўніку ўрачыстасці плаціць штраф у памеры 700 тысяч рублёў за парушэнне парадку арганізацыі і правядзення масавага мерапрыемства. Так вырашыў суд. Тым болей што ў ходзе «тусоўкі» ўзнікалі дробныя бойкі, здараліся крадзяжы мабільных тэлефонаў. А шэсць чалавек пасля заканчэння селі за руль у нецвярозым стане. Цікава, што імяніннік у гэтым годзе скончыў адну са сталічных ВНУ. Чалавек ён адукаваны і законы ведае. А перад самым «святам» яго папярэджвалі ў міліцыі пра магчымую адказнасць за яго ўчынак.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

**Дополнение к извещению о проведении открытого аукциона (газета «Звязда» № 134 от 13.07.2010 г., 7-я полоса)**

Организатор аукциона: РУП «Белтелеком» в лице Витебского филиала РУП «Белтелеком», находящегося по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19.

Аукцион состоится 16.08.2010 г. в 10.00 по адресу: 210600, г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, конференц-зал.

Документы на участие в аукционе принимаются с 01.07.2010 г. по 13.08.2010 г. в рабочее время (с 9.00 до 16.00) по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. № 509-п. Документы, поданные после 16.00 13.08.2010 г., не рассматриваются.

Заключительная регистрация участников аукциона в день проведения аукциона с 9.00 до 10.00 по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. 509-п.

**Телефоны для справок: (0212) 27 11 58, 27 29 45, 27 29 42, 25 82 11, факс (0212) 27 18 81.**

УНП 300977657

белагропромбанк — традиции будущего

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

**СООБЩАЕТ, ЧТО 13 АВГУСТА 2010 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ**

220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

Повестка дня

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 3 августа 2010 года.

Акционеры банка могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк»: г.Минск, проспект Жукова, 3.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров.

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 11 августа 2010 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 19 августа 2010 года.

**Телефоны для справок: 8(017) 229 64 59, 229 64 51.**

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

время работы Контакт-Центра Банка
8.00–20.00 – рабочие дни
8.00–18.00 – выходные и праздничные дни

Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

*Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь*

УНП 100693551

ISSN 1990 - 763X

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.08.2010 г. (для б/н разлікаў)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 2 968,00 | 1 чэшская крона | 157,83 |
| ▼ 1 еўра | 3 920,43 | 1 польскі злоты | 973,48 |
| 1 латвійскі лат | 5 531,12 | ▲ 1 расійскі рубель | 99,61 |
| 1 літоўскі літ | 1 134,30 | 1 украінская грыўня | 376,10 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 29,7958 |
| 10 UAH | 37,7492 |
| 1000 BYR | 10,0154 |
| EUR | 39,3781 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

5 жніўня 2010 г.
№ 27 (221)


ПАРАДАК НА ЗЯМЛІ

## Агароджа за кошт бюджэту — НЕДАЗВАЛЯЛЬНАЯ РАСКОША

**Летась вёска Міхалёва Бабруйскага раёна заняла трэцяе месца на рэспубліканскім конкурсе па добраўпарадкаванні сярод населеных пунктаў. Атрыманая прэмія пайшла на замену агароджы на мясцовых могілках, на абсталяванне для дзіцячых пляцовак і на ўстаноўку дадатковых кантэйнераў для смецця.**

На мэты добраўпарадкавання і вулічнага асвятлення 13 сельскіх і пасялковых Саветаў у раённы бюджэт закладваецца 700—800 мільёнаў рублёў у год. Дадаткова выдзяляюцца грошы на ўпарадкаванне памятных месцаў, помнікаў. Летась на прывядзенне ў парадак брацкіх магіл было выдаткавана 90 мільёнаў, сёлета — 60 мільёнаў. Асаблівай увагі патрабуе мемарыяльны комплекс у вёсцы Сычкава, узведзены ў гонар вайскоўцаў 1-га Беларускага фронту і партызанаў Бабруйскага раёна, якія ў чэрвені 1944 года знішчылі Бабруйскую частку групы арміі «Цэнтр». У склад комплексу ўваходзіць Курган Славы, дзе закладзеныя капсулы з зямлёй з 70 брацкіх магіл Бабруйшчыны, чатырохметровая скульптурная кампазіцыя на 18-метровым пастаменце, шэсць стэл у гонар землякоў — Герояў Савецкага Саюза, Брама Славы, 13 памятных шыльдаў, прысвечаных загінулым падчас Бабруйскай аперацыі, і ДЗОТ-помнік. Добраўпарадкаванне комплексу ажыццяўляецца за сродкі раённага бюджэту.

— Ва ўмовах жорсткай эканоміі, у якіх нам усім даводзіцца жыць і працаваць, мы сталі больш ашчадна ставіцца да бюджэтных грошай і пастараліся максімальна аптымізаваць расходы, — патлумачыў **старшыня Бабруйскага раённага Савета дэпутатаў Леанід БАРКОЎСКІ**. — Так, апошнія два гады мы больш не будуем насельніцтву агароджы за кошт мясцовых бюджэтаў. Асабіста я лічу гэта вельмі слушным рашэннем, бо на гэтай глебе мы парадзілі вельмі шмат утрыманцаў, аматараў вырашыць асабістыя праблемы за дзяржаўныя сродкі. У сённяшніх няпростых умовах мы не можам дазволіць сабе раскідвацца бюджэтнымі грашыма, і сёння кожны гаспадар у нашым раёне ставіць сабе агароджу за ўласныя сродкі.

Ільвіную долю расходаў бюджэтаў сельвыканкамаў складаюць выдаткі на добраўпарадкаванне грамадскіх месцаў (паркаў, сквераў), грамадскіх могілак, якіх у раёне 95 (гэта работы па замене агароджаў, высяканні аварыйных дрэў і парасткаў, устаноўцы кантэйнерных пляцовак), на абуладкаванне грамадскіх шахтавых калодзежаў (іх у рэгіёне 1241).

— Заменай навесаў, ачысткай вады ў калодзежах, іх хлараваннем пакуль што займаюцца сельвыканкамы, бо мы яшчэ не перадалі іх камунальнай службе, — адзначыў Леанід Баркоўскі. — Але ў нашых найбліжэйшых планах — перадача грамадскіх калодзежаў і кантэйнерных пляцовак на баланс ЖКГ. Да жыллёва-камунальнай службы пяройдуць і грамадскія могілкі. Мы цяпер вядзём адпаведныя работы, і, думаю, да канца года ўсе гэтыя пытанні закрыем. Наш камбінат бытавога абслугоўвання робіць драўляныя навесы для калодзежаў, бетонныя кольцы, агароджы. Мы даём заяўку, яны яе выконваюць, прывозяць гатовы заказ, уласнымі сіламі ўстанаўліваюць, а нам застаецца толькі разлічыцца. Такім чынам мы адначасова і вырашаем пытанне добраўпарадкавання грамадскіх калодзежаў, і падтрымліваем «бытоўку».

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

## СЕМ РАЗОЎ АДМЕРАЙ...

**Дзесяць гадоў таму, заехаўшы ў вёску якога-небудзь з прысталічных сельсаветаў, можна было назіраць звыклую карціну ў выглядзе гаспадарчага смецця, «аформленага» ў несанкцыянаваныя звалкі. Прысталічны раён, які заўсёды выконваў функцыю «дачнай тэрыторыі», зоны адпачынку для мінчан, патанаў у бытавых адходах, барацьба з якімі практычна поўнасцю ляжала на плячах сельскіх Саветаў. Доўгі час смецце і, адпаведна, прыборка тэрыторыі былі для іх праблемай нумар адзін. Да таго моманту, пакуль пры сельвыканкамах не з'явіліся свае невялікія камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы (КУПы). Менавіта апошнія ўзялі на сябе асноўныя клопаты па добраўпарадкаванні тэрыторый. У некаторых сельсаветах Мінскага раёна гэта справа была наладжана лепш, у некаторых крыху горш, але факт застаецца фактам: камунальныя прадпрыемствы «мясцовага маштабу» да нядаўняга часу рабілі канкрэтны (і не маленькі!) унёсак у навядзенне парадку на сваёй тэрыторыі...**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Але, падобна, існаваць ім засталося нядоўга: КУПы, што працуюць пры сельвыканкамах Мінскага раёна, у хуткім часе будуць перададзеныя ў структуру раённага жылкамунгаса. І, адпаведна, перастануць падпарадкоўвацца ранейшым «працадаўцам» — першаснаму звяну ўлады, сельвыканкамам.

Нельга сказаць, што ў шарэнгах апошніх пануе з гэтай нагоды радасны настрой. Хоць, здавалася б, баба (у нашым выпадку КУПы) з калёс — каню свята: колькі можна сельвыканкамам займацца гаспадарчай дзейнасцю? Насамрэч, кіраўнікі некаторых прысталічных сельсаветаў — асабліва тых, дзе КУПы бралі на сябе львіную долю праблем з добраўпарадкаваннем і вывазам цвёрдых бытавых адходаў — знаходзяцца ў роспачы. І ёсць ад чаго: ліквідацыя сельскіх камунальных прадпрыемстваў, якія вырашалі шэраг надзённых пытанняў (абкос грамадскіх тэрыторый, паркаў, могілак, вываз смецця і несанкцыянаваных звалак, дробны рамонт дарог і г.д.), можа балюча ўдарыць па іміджы мясцовай улады. Паколькі менавіта яна адказвае за ўзровень жыццезабеспячэння і вонкавы выгляд сваёй тэрыторыі.

Міханавіцкі сельсавет — адзін з самых буйных у Мінскім раёне: пятнаццаць населеных пунктаў і амаль дзевяць тысяч насельніцтва. Тут пануе своеасаблівая псіхалогія «яшчэ не гараджане, ужо не вяскоўцы». Адсюль і амаль што сталічныя патрабаванні да сельвыканкама: людзі ўзнімаюць пытанні, нават ведаючы, што па аб'ектыўных прычынах вырашыць іх немагчыма. Ім патрэбны добрыя дарогі, чыстыя вуліцы, акультураныя скверы, дагледжаныя месцы пахаванняў і многае іншае... У свой час стварэнне ўласнага КУПа бачылася старшыні Міханавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Святлане Давальцовай як выйсце з сітуацыі, выратаванне. Камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Трансміс» з'явілася пры сельвыканкаме пяць гадоў таму.

Давальцовай з самага пачатку імпанавала ідэя стварэння самастойнай камунальнай адзінкі, якая мела б свой статус і пры гэтым напрамую падпарадкоўвалася б сельвыканкаму... За некалькі гадоў работа камунальнага прадпрыемства была адладжана так (дзякуючы ў першую чаргу яго дырэктару Аляксандру Яцкаўцу), што яно ледзь паспявала спраўляцца з патокам заказаў — ад фізічных і юрыдычных асобаў. У абавязкі КУП «Трансміс» уваходзіла прыборка грамадскіх тэрыторый сельсавета, добраўпарадкаванне 9 грамадскіх могілак, штотыднёвае навядзенне парадку ў 4 парках і зонах адпачынку, вываз смецця з грамадскіх тэрыторый і падворкаў грамадзян, дробны рамонт і расчыстка дарог. Акрамя гэтага, прадпрыемства адказвала за дастаўку насельніцтву (у першую чаргу інвалідам і ветэранам) брыкету, дроў і будматэрыялаў, за іх пагрузку і разгрузку, за апрацоўку прысядзібных участкаў для вядзення ўласнай падсобнай гаспадаркі.

— Я пакуль што не ўяўляю сабе, якім чынам нехта іншы — той жа жылкамунгас Мінскага раёна — здолее пераняць гэту эстафету, — кажа Святлана Давальцова. — Тэарэтычна, на паперы, усё можа быць распісана прыгожа і правільна. Але што я патлумачу, напрыклад, чалавеку, якому неабходна, каб «хуткая дапамога» прайшла па дарозе менавіта цяпер, а не пасля таго, як яе расчысцяць ад снегу «па графіку»?.. А наш КУП заўсёды і ўсё імкнуўся рабіць своечасова, бо знаходзіцца тут, на сваёй тэрыторыі, а не за 20—30 кіламетраў. Ад колькасці і, галоўнае, ад якасці паслуг, якія аказвае людзям прадпрыемства «Трансміс», напрамую залежыць зарплата яго работнікаў. Яны зацікаўленыя зрабіць больш і лепш, і насельніцтва ад гэтага толькі выйграе... Ці здолее раённая жыллёва-камунальная гаспадарка арганізаваць працу так, каб патрэбныя спецыялісты выязджалі на месца літаральна па званку, без прамаруджвання?

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

## «ЛЮБЫ КАПРЫЗ, АЛЕ ЗА ВАШЫ ГРОШЫ...»

### Ліст у рэдакцыю:

*«Добры дзень, «Звязда»! Выпісваю газету ўжо досыць даўно, некалькі разоў давялося і звяртацца — па юрыдычных пытаннях, пытаннях медыцыны. Што важна — заўсёды атрымлівала слушны адказ ці параду, за якія яшчэ раз хацелася б падзякаваць усім, хто ў газеце працуе. А заадно — падзяліцца чарговай бядой.*

*Пачалося ўсё 22 гады назад, калі наша сям'я прыехала на працу ў вёску Арэхаўка Клічаўскага раёна. Тут нам далі кватэру ў 16-кватэрным доме, а за вёскай выдзелілі ўчастак, дзе мы, 8 сем'яў, пабудавалі сабе хлявы. Саўгас тады — дзякуй — дапамог будматэрыяламі, нам правялі водаправод, зрабілі агульную калонку. У нас там нават электрычнасць была! І хоць яно цяжка амаль паўкіламетра хадзіць да тых пабудоў, прычым па некалькі разоў на дні, але мы хадзілі. Кожны гаспадар трымаў карову, іншую свойскую жывёлу, мы былі маладыя і да ўсяго прывыклі.*

*Потым змяніўся час, і пачаліся розныя непрыемнасці. Папершае, у нас не стала электрычнасці, па-другое, пачалі браць плату за ваду (у залежнасці ад колькасці жывёлы), потым тую ж плату браць чамусьці перасталі. А да ўсяго сапсавалася наша калонка.*

*Што рабіць? Напісала заяву ў Клічаўскае аддзяленне ЖКГ з просьбай адрамантаваць, абяцала плаціць за ваду дадаткова — колькі будзе патрэбна. Але прыехаў экскаватар, калонку нашу... знёс, яшчэ і месца зраўняў, быццам нічога там не было. Мне ж інжынер сказаў, што за вёскай ніякай калонкі быць не павінна, а ў кватэры ў нас вада ёсць...*

*Але ж ад той маёй кватэры, ад дома да хлява метраў 400, за дзень трэба занесці вядзёр 10 вады. Асабліва цяжка зімой, калі сцежку замятае снегам ці настае галалёд. А мы ж ужо не маладыя — мне налета на пенсію...*

*Казала пра гэта дырэктару ЖКГ. Ён паабяцаў правесці водаправод хоць проста ў хлеў да мяне, але за грошы, за вялікія грошы. Каб іх аддаць камунальнікам, мне трэба... прадаць тую самую карову.*

*Вось я і хацела б запытацца, ці законна знеслі нашу калонку? І ці так трэба падтрымліваць падсобную гаспадарку ў вёсцы?*

*Яшчэ скажу, што суседзі мае кароў ужо пазбывалі, засталася толькі ў мяне. Дакуль? Не ведаю.*

***Г. Русецкая,** в. Арэшкавічы, Клічаўскі раён.*

### Ліст з рэдакцыі

Добрых дзён Вам, шаноўная Галіна Іванаўна!

Найперш — шчыры дзякуй за тое, што выпісваеце найстарэйшую беларускую газету, што чытаеце і нават пішаце. У падобных лістах, як у люстэрку, адбіваецца наша жыццё — такое, як ёсць, з усім «комплексам» і разумных і, скажам так, не вельмі разумных рашэнняў. Прынамсі, прыйшла ж у нейкую «светлую» галаву ідэя засяляць вяскоўцаў «на галовы адзін аднаму» — у 16-кватэрныя дамы (а то ж у нас зямлі бракуе!), «не псаваць» іх жытло хлявамі ды адрынамі, не пакідаць пад вокнамі месца для саду і агарода... А што — хай «па-людску» людзі жывуць, хай па-гарадскому: схадзілі на працу, прыйшлі дамоў — ды ляжыце сабе...

Дзякаваць Богу, не ўсе вяскоўцы гэтага хочуць: характары ў людзей іншыя! Ды што там — нават арганізмы: як казала знаёмая кабета, у мяне алергія на ўсё магазіннае, а сваё — ем і хоць бы хны...

Аднак будаваць хлявы, заводзіць гаспадаркі (не зважаючы на адлегласці, на цяжкасці) навасёлаў з той жа Арэхаўкі падбіла, відаць, не столькі гэта жаданне — есці і дзяцей карміць сваім, свежым, смачным, экалагічна чыстым. За працу — у полі, на ферме, на ФАПе, у вясковай бібліятэцы і г.д., і плацілі, і плацяць, і нават (бяруся сцвярджаць. — **Аўт.**) будуць плаціць (ну што з гэтым зробіш?) зусім не так, як на заводах... Магчыма — з разлікам якраз на тое, што гэта ж вёска, гэта ж зямля, а значыць, свая бульбіна ў чалавека, свой яблык, сваё мяса-малако. Ды яшчэ і капейка, калі лішкі іх прадаць ці здаць дзяржаве.

Таму, відаць, адміністрацыя саўгаса і падтрымала тады навасёлаў — выдзеліла тыя ж будматэрыялы, дапамагла правесці электрычнасць, ваду.

Што ж потым? Вы, Галіна Іванаўна, пішаце, што змяніўся час. Гэта бясспрэчна. Аднак, як высветлілася, не памяняліся людзі, літаральна: гэта значыць, адзін і той жа чалавек — Валянцін Мечыслававіч Язвінскі (тады галоўны інжынер саўгаса «Дабраахвотнік») разумеў і спрыяў навасёлам, цяпер... ён жа — дырэктар Клічаўскага ўнітарнага камунальнага прадпрыемства «Жылкамунгас» — паводле Вашага ліста — не разумее і нават шкодзіць.

Што, ну згадзіцеся, не можа не выклікаць заканамерных пытанняў — да таго ж Валянціна Мечыслававіча.

— У вёсцы Арэхаўка якраз тады, калі засяляўся гэты 16-кватэрны дом, — патлумачыў спадар Язвінскі, — я будаваўся сам, сам жа трымаў кароў. У мяне іх пяць штук было... Так што калонку побач з хлявамі, пра якія піша Галіна Іванаўна, паставілі па маёй ініцыятыве — патрэбна была. І карысталіся ёй усе — хто хацеў і калі хацеў...

Але ж гэтак было раней. Хто тады (ды яшчэ ў вёсцы) чуў, каб ваду на кубаметры мералі? Хто лічыў, колькі каштуе электрычнасць, патрэбная на яе падачу? Цяпер жа іншы час — цяпер трэба ўсё лічыць і за ўсё плаціць.

Не скажу, заяўніца гэта рабіла. Але што мне, як кіраўніку прадпрыемства, узяць з тых, хто ля іхняй (а па сутнасці нічыйнай) калонкі прывык мыць машыны?.. Да таго ж на яе не раз звяртала ўвагу санстанцыя, на яе ж некалькі разоў, што называецца, наязджала тэхніка — гнулі, ламалі... А рамонт — гэта дадатковыя расходы. З чыёй кішэні? Нашага прадпрыемства. А яна ж не бяздонная. Асабліва па сённяшнім часе...

Карацей, па маёй ініцыятыве тую калонку правялі, паставілі, па маёй і знеслі... Тут дарэчы будзе сказаць, — працягваў Валянцін Мечыслававіч, — што ваду там бралі не толькі з яе: метраў за 30 ад хлявоў помпавая станцыя ёсць...

Пра гэта ў нас з Галінай Русецкай размова была: як быццам, усё патлумачыў ёй, сказаў: «Пішыце заяву — 10 дзён і будзе вада! Прычым у вашым жа хляве. Для каровы нават паілачку можам зрабіць. І лічыльнік там жа паставім: колькі вады скарыстаеце, за столькі заплаціце... Ні больш, ні менш. Што называецца, любы капрыз, але ж за вашы грошы — ну хоць часткова.

Быў там наш інжынер, зрабіў адпаведныя разлікі. Сума атрымалася і сапраўды круглая: за ўсё пра ўсё жанчыне трэба заплаціць больш чым паўтара мільёна рублёў. Разумею — гэта нямала. І я не з Месяца зваліўся: даходы вяскоўцаў ведаю, сацыяльную накіраванасць нашай палітыкі разумею. І таму, як кіраўнік прадпрыемства, згодзен на кампраміс: дзесяць «мінімалак» (гэта 350 тысяч) з заяўніцы, астатнія расходы возьмем на сябе мы.

Пра гэткі варыянт рашэння праблемы жанчына абяцала падумаць і потым прынесці заяву.

...Як трэба разумець, яна, гэтая заява, прыйшла ў рэдакцыю «Звязды».

Тут, ну вядома ж, няма спецыялістаў, якія маглі б адрамантаваць (а тым больш паставіць новую калонку замест старой). Тут ёсць іншае — магчымасць агучыць, абнародаваць праблемы людзей, пасля чаго яны, гэтыя праблемы, пачынаюць здавацца... цалкам вырашальнымі.

Адзінае — трэба ўсё яшчэ раз узважыць.

І пайсці на кампраміс.

Каму? На месцы, як падаецца, гэта відней.

**Валянціна ДОЎНАР.**

## НІЗКІ ДАХОД — ЯШЧЭ НЕ ГАРАНТЫЯ

**Папярэднія прагнозы спраўдзіліся: пасля змянення са студзеня правілаў аказання адраснай сацыяльнай дапамогі колькасць яе атрымальнікаў прыкметна ўзрасла. Напрыклад, толькі за першую палову года ў дастаткова «сярэднім» па памерах Асіповіцкім раёне адрасную падтрымку атрымалі больш чым 900 чалавек. І разам з тым сцвярджаць, што была задаволеная літаральна кожная заява ад грамадзян з малымі даходамі, таксама нельга — выплаты прызначылі далёка не ўсім.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Білет ці мільён?

Сёлета па-сапраўднаму новым напрамкам адраснай падтрымкі стала бясплатнае выдзяленне сродкаў тэхнічнай рэабілітацыі інвалідам III групы, а таксама дзецям ва ўзросце да 18 гадоў, якія інвалідамі не з'яўляюцца, але, паводле рэкамендацый урача, маюць патрэбу ў тых жа гарсэтах, бандажах ці распорках. Прычым асаблівых пытанняў тут няма.

Працуе прыкладна наступная схема: інваліды III групы ці бацькі дзяцей з парушэннямі здароўя бяруць медыцынскае заключэнне і прыносяць яго ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. А надалей ёсць два варыянты: упраўленне або выдзяляе грошы на самастойную аплату слыхавых апаратаў, пратэзаў вачэй, тэст-палосак для вызначэння цукру ў крыві, інсулінавых шпрыцаў ці іголак для шпрыц-ручак у крамах медтэхнікі, або пералічвае сродкі на рахунак Беларускага пратэзна-артапедычнага аднаўленчага цэнтра для вытворчасці неабходных пратэзаў, артэзаў ці вырабаў лячэбнага пратэзавання.

— У апошнім выпадку чалавек павінен зрабіць тыя ж замеры, а значыць, яму давядзецца наведаць пратэзна-артапедычны цэнтр у сталіцы, — заўважае намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Асіповіцкага райвыканкама Ніна Лапанік. — Зразумела, што тут могуць узнікаць пэўныя цяжкасці. І разам з тым, скаргаў пакуль не было. Магчыма таму, што рашэнне аб бясплатным забеспячэнні інвалідаў III групы і дзяцей неабходнымі сродкамі рэабілітацыі аказалася насамрэч доўгачаканым — яшчэ летась за гэтыя сродкі ім трэба было плаціць з уласнай кішэні, і часам гаворка ішла аб сумах больш чым у мільён рублёў.

### Палова стаўкі — не той фармат

Больш няпростай аказалася сітуацыя з «традыцыйнай» штомесячнай адраснай сацыяльнай дапамогай. Права на яе па-ранейшаму дае даход, меншы за бюджэт пражытковага мінімуму (ці на сёння — меншы за 274 510 рублёў на чалавека). Аднак сёлета падобная дапамога можа прызначацца не на тры месяцы, а на паўгода. Прычым на гэтую акалічнасць адразу ж звярнулі ўвагу.

— Па папулярнасці бясспрэчна на першым месцы была і застаецца менавіта штомесячная адрасная сацыяльная дапамога, — адзначае Ніна Лапанік. — Яшчэ летась мы пачалі актыўна расказваць аб новаўвядзеннях, ладзілі спецыяльныя дні інфармавання, рабілі паведамленні праз раённыя СМІ, працавалі з сельсаветамі, паліклінікамі, дамамі сацыяльных паслуг, і нават зрабілі «выбарку» асобаў з пенсіямі ніжэй за бюджэт пражытковага мінімуму — пазней да такіх грамадзян абавязкова прыходзілі з тлумачэннямі сацыяльныя работнікі. Пры гэтым трэба прызнацца, што вынік быў. У першыя тры месяцы года да нас масава пайшлі людзі. Але тут жа высветлілася, што многія пачулі выключна аб магчымасці больш працяглага атрымання адрасных выплат. І разам з тым чамусьці засталося «па-за кадрам» іншае — новыя патрабаванні да прэтэндэнтаў на адрасную дапамогу. Так, цяпер вызначана: разлічваць на яе можна, калі працуеш не на 0,25 і не на 0,5, а менавіта на цэлую стаўку. Якраз недастатковая занятасць па ўласным жаданні і стала прычынай часткі адмоў.

Яшчэ адна падстава для адмовы ў падтрымцы — утойванне рэальных даходаў. Як правіла, гэта датычыцца сем'яў, якія лічацца няпоўнымі. І ў той жа час на справе маюць... грамадзянскага мужа ці жонку.

— Фармальна пацвердзіць грамадзянскі шлюб можа раённая камісія па прызначэнні дапамогі, але гэта ўдаецца не заўсёды, — кажа Ніна Лапанік. — Часам здараецца, што ў няпоўнай сям'і маці з дзецьмі маюць даход усяго па 20 тысяч рублёў на чалавека ў месяц, і, зразумела, што без фінансавай падтрымкі збоку тут не абыходзіцца. Аднак маці ўпарта стаіць на сваім: так, я жыву з гэтым мужчынам, але агульную гаспадарку мы не вядзём, кожны з нас забяспечвае сябе сам. І даказаць адваротнае амаль нерэальна.

У дадатак, перакананыя ў раёне, нялішне было б вызначыцца і з поўнымі сем'ямі, дзе бацька нідзе не працуе ці працуе няпоўны год. Сёння дапамога такім сем'ям прызначаецца (адно не робіцца налічэнне на таго ж бацьку). І гэта — таксама даволі спрэчны момант. Бо часта такія сем'і далёка не самыя бедныя — дзякуючы «неафіцыйным» заробкам мужа ў Расіі.

— Змена «правілаў гульні» — з'ява цалкам нармальная, бо падказаць «праблемныя месцы» можа толькі практыка, — працягвае Ніна Лапанік. — Скажам, не так даўно было вырашана пытанне з «шоп-турамі» ва Украіну для бацькоў са шматдзетных сем'яў. Вядома, што гэта — не забаўляльны турызм, а па сутнасці вымушаная неабходнасць. Таму вельмі добра, што цяпер тут ёсць новы падыход: калі такія бацькі выязджалі за мяжу не больш чым на тры дні менавіта для набыцця адзення і абутку, то права на адрасную сацыяльную дапамогу застаецца. Але трэба ісці і далей — прымаць рашэнні наконт канкрэтных ацэнак вядзення ці невядзення сумеснай хатняй гаспадаркі ў грамадзянскіх шлюбах, а таксама наконт бацькоў з «няпэўнымі заняткамі». Прычым рабіць гэта неабходна на заканадаўчым узроўні.

### Важкі аргумент

І ўсё ж найбольш папулярная прычына для адмовы ў штомесячнай адраснай сацыяльнай дапамозе — гэта перавышэнне даходаў над узроўнем пражытковага мінімуму. Дзеля справядлівасці, тут ёсць альтэрнатыўныя варыянты, і ў прыватнасці, дапамога аднаразовая. Калі яшчэ летась прэтэндаваць на яе маглі асобы з даходам, ніжэйшым за 120, то цяпер — з даходам, ніжэйшым за 150 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму. А апошняя «планка» на сёння складае 411 765 рублёў.

— Умовай для прызначэння аднаразовай адраснай дапамогі з'яўляецца выкарыстанне ўсіх іншых відаў дзяржпадтрымкі, — падкрэслівае Ніна Лапанік. — Напрыклад, раней маці, якой была прызначана дзіцячая дапамога і бясплатнае харчаванне на дзіця ва ўзросце да 2 гадоў, фактычна адразу ж пасля гэтага заставалася «за бортам» — сёння ж яна ўжо мае права на аднаразовую выплату. Пашырылася колькасць атрымальнікаў аднаразовай дапамогі і за кошт іншых катэгорый — перш-наперш гаворка аб інвалідах і пенсіянерах.

Дзеля справядлівасці неабходна заўважыць: сам па сабе невысокі даход права на аднаразовую дапамогу яшчэ не дае. Адначасова тут неабходна прызнаць, што чалавек патрапіў у па-сапраўднаму крытычную жыццёвую сітуацыю. Прычым гаворка не толькі аб пажары ці стыхійным бедстве. Скажам, адназначна прэтэндаваць на выплаты могуць грамадзяне з невысокімі заробкамі, якія не па сваёй віне працуюць у рэжыме чатырохдзёнкі. Або, што ўдвая актуальна апошнім часам — грамадзяне, якім неабходна набыць дарагія імпартныя лекі.

**Сяргей ГРЫБ.**

*Асіповіцкі раён.*


**ОАО «БЕЛАТТРАКЦИОН»**

**ПРОВОДИТ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**Собрание состоится 16 августа 2010 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Могилевская, 68, каб. 13.**

**Повестка дня:**

1. Назначение председателя ликвидационной комиссии.
2. Утверждение промежуточного ликвидационного баланса.

С проектом решения можно ознакомиться с 6 августа по указанному адресу. Начало регистрации участников за час до собрания. При себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров — доверенность).

*УНП 100061627*

# СЕМ РАЗОЎ АДМЕРАЙ...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Сёння, па словах Святланы Давальцовай, КУП здымае да 50 працэнтаў пытанняў, што датычацца «твару» сельсавета, яго вонкавага выгляду, добраўпарадкавання. Ён працуе з аптымальнай аддачай у межах сваіх магчымасцяў. Два трактары МТЗ, выдзеленыя некалі раённай прыродаахоўнай службай, выконваюць функцыі і грузавых, і смеццеўборачных машын. Словам, гэта мабільнае звяно, якое можна назваць «хуткай дапамогай» у сферы камунальных паслуг, сцвярджае старшыня Міханавіцкага сельскага Савета. І вельмі непакоіцца, што «планка» па навядзенні парадку, узнятая за гады існавання «Трансміс», можа апусціцца пасля ўлівання КУПа ў структуру ЖКГ Мінскага раёна.

— Узяць хоць бы такое надзённае пытанне, як забеспячэнне насельніцтва палівам, брыкетам. Яго звычайна дастаўляюць з Пухавіцкага раёна ці Заслаўя, але транспартныя расходы такія, што перакрываюць кошт самога брыкету. А наш КУП возіць яго двума прычэпамі адначасова для двух заказчыкаў, што дазваляе людзям падзяліць затраты на дваіх... Хто будзе займацца такімі паслугамі пасля рэарганізацыі?

Прыярытэтнай задачай для «Трансміс» быў і пакуль што застаецца вываз смецця і цвёрдых бытавых адходаў. У сэнсе «вытворчасці» гэтых адходаў прысталічныя тэрыторыі — проста кландайк, і Міханавіцкі сельсавет не выключэнне. Нават тыя людзі, якія жывуць у невялікіх вёсках, не хочуць закапваць смецце ў зямлю або спальваць у печках.

— Ды і як спальваць, калі мы спажываем суцэльны пластык? Я сама родам з вёскі, і ў мяне таксама была праблема: куды выкідваць бляшанкі з-пад кансерваў, накрыўкі з-пад закатак, разбітае шкло, пластыкавыя ўпакоўкі і гэтак далей... Такое «дабро» ў зямлю не закапаеш, тым больш на сваім участку, — кажа Давальцова. — Таму аб'ёмы бытавых адходаў год ад году будуць толькі расці. Ці хопіць у нас магутнасцяў справіцца з імі без КУПа?

Менш за ўсё, прызнаецца Святлана Уладзіміраўна, ёй хацелася б, каб пасля рэарганізацыі сістэмы раённай ЖКГ нехта з навaспечанай структуры заявіў, што «абслугоўваць усе вашы аб'екты, усе грамадскія тэрыторыі ў такім хуткім тэмпе мы не можам».

Як ні дзіўна, сёння з гэтай задачай спраўляецца невялікі КУП. І ў першую чаргу менавіта таму, што знаходзіцца побач з патрэбамі чалавека. Таго самага, пра якога павінна думаць і клапаціцца мясцовая ўлада.

— Магчыма, ёсць сэнс хоць бы ў паэтапным «выключэнні» КУПаў, пачынаючы з тых, якія не вельмі запатрабаваныя ў сваіх сельсаветах, — дзеліцца сваімі меркаваннямі Святлана Давальцова. — І калі рэарганізацыя ЖКГ непазбежная, хацелася б, каб спачатку была створана сістэма. Каб грамадзянін ведаў, што ёсць камунальная структура, падраздзяленне, звяно, якое можа адразу адгукнуцца на сігнал. Калі так атрымаецца, я буду гэта толькі вітаць.

**Наталля КАРПЕНКА.**

# Агароджа за кошт бюджэту — НЕДАЗВАЛЯЛЬНАЯ РАСКОША



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Сёлета рашэннем сесіі раённага Савета дэпутатаў сельсаветы дадаткова атрымалі па 5 мільёнаў рублёў на ліквідацыю несанкцыянаваных, стыхійных звалак, якія перыядычна ўзнікаюць ля населеных пунктаў. Цэнтралізаваным вывазам смецця ў раёне ахоплена 70 працэнтаў населеных пунктаў. У буйных вёсках і ў цэнтральных сядзібах устаноўлены кантэйнерныя пляцоўкі.

...На навядзенне парадку на зямлі і на добраўпарадкаванне населеных пунктаў ідуць і грошы, атрыманыя ад аўкцыёнаў. Іх дазволена праводзіць у прыгарадных населеных пунктах (Шчаткава, Бярэзавічы, Сычкава, Міраціна). Летась на аўкцыёнах прыгарадныя сельвыканкамы зарабілі 70 мільёнаў рублёў.

Навядзенне парадку на зямлі прадугледжвае і вяртанне пустых участкаў у севазварот. Пазалетась у СВК раёна было перададзена 200 га такіх земляў. Яшчэ 110 га — за першыя месяцы 2010 года. Гэта былыя надзелы грамадзян, выдзеленыя некалі для вядзення сельскай гаспадаркі.

Не сакрэт, што пустыя, кінутыя дамы, як правіла, ператвараюцца ў несанкцыянаваныя звалкі. Мясцовыя жыхары нясуць туды і пластык, і шкло, і іншае смецце, чым ствараюць пажаранебяспечную сітуацыю. Таму знос такіх развалюх — адна з першасных задач мясцовых уладаў.

— Штогод мы ліквідуем ад 45 да 60 пустых дамоў, — патлумачыў старшыня райсавета. — Летась на гэтыя мэты нам з вобласці выдаткавалі 40 мільёнаў рублёў, яшчэ столькі ж — сёлета. З пачатку года сіламі сельвыканкамаў ужо знесена 13 дамоў. Яшчэ 12 — за сродкі спадчыннікаў, якіх атрымалася знайсці... Да зносу старога жылля мы прыцягваем дарожныя і меліярацыйныя службы, а таксама мясцовыя СВК. Там у асноўным патрэбна гусенічная тэхніка, бо знесці верхнюю частку хаты — не складана, цяжкасці, як правіла, узнікаюць з фундаментамі.

На жаль, завяршыць работы па зносе старых дамоў цалкам не атрымаецца: яны паступовa ўтвараюцца зноў, але не такія страшныя, як былі на пачатку работ. Раней пустыя дамы стаялі без дахаў, без вокнаў, аднак, дзякуючы агульным намаганням, такіх развалюх у нашым раёне засталося зусім мала.

Мы ў ліку першых у вобласці правялі ўсе працэдуры па рэгістрацыі пустога старога жылля, прайшлі праз суды, дзе гэтыя дамы былі прызнаны безгаспадарчымі і перададзены на баланс сельвыканкамаў. Аднак неаднойчы здаралася, што пасля вынясення рашэння суда знаходзіліся спадчыннікі, якія аспрэчвалі гэтае рашэнне, і суд аднаўляў іх у правах на нерухомасць. Падкрэслю: сельскім Саветам неабходна дасканала прытрымлівацца ўсіх юрыдычных працэдур, бо прыватная ўласнасць — рэч сур'ёзная. Наша раённая служба ЖКГ узяла пытанне зносу старых дамоў на свой асабісты кантроль. У гэтым плане ў нас ёсць парадак і значныя станоўчыя зрухі.

Дарогі сельскіх населеных пунктаў Бабруйшчыны перададзены на баланс спецарганізацый пакуль толькі ў аграгарадках. Далей працэс «забуксаваў» з-за адсутнасці на нічыйныя дарогі адпаведнай дакументацыі.

— Толькі за акт адводу зямлі неабходна заплаціць 12-15 мільёнаў, — прывёў лічбы Леанід Баркоўскі. — А дакументаў для перадачы кожнай дарогі трэба зрабіць шмат. Менавіта таму пакуль яшчэ не ўсе дарогі ўнутры населеных пунктаў перададзены на баланс дарожнікаў.

Цэнтральныя вуліцы і сёння абслугоўваюцца дарожнымі арганізацыямі. Астатнія пакуль «курыруюць» сельвыканкамы. Сёлета з рэспубліканскага дарожнага фонду ў раённы бюджэт заклалі 270 мільёнаў рублёў. На гэтыя грошы праводзіцца падсыпка дарог у 17 вёсках.

Напярэдадні апошняга асенне-зімовага перыяду ў раёне існавала праблема з вулічным асвятленнем. Яна ўзнікла пасля таго, як сельскім Саветам забаранілі набываць замежнае абсталяванне, у тым ліку і лямпачкі.

— Частка энергазберагальных ліхтароў у вёсках рэгіёна — нямецкай і польскай вытворчасці, і беларускія лямпачкі для іх не падыходзілі, — патлумачыў старшыня райсавета. — Там, дзе на вуліцах былі ўстаноўлены айчынныя ліхтары, падчас падрыхтоўкі да зімы лямпачкі мы своечасова замянілі. А для замежным ліхтароў не змаглі набыць лямпачкі, з-за чаго і не аднавілі вулічнае асвятленне ў поўным аб'ёме. Цяпер — пасля разгляду праблемы адпаведнымі камісіямі — нам дазволілі набываць лямпачкі замежнай вытворчасці.

Добраўпарадкаванне — неад'емная частка работы і штодзённы клопат мясцовых Саветаў, падкрэсліў Леанід Баркоўскі. Ужо сёння ў 9 аграгарадках раёна створаны камфортныя, на ўзроўні вялікіх гарадоў, умовы пражывання. У астатніх вёсках «фронт работ» яшчэ значны, аднак у вырашэнні пытанняў добраўпарадкавання не трэба заніжаць і ролю саміх жыхароў. Чысціня вакол нас залежыць ад нас саміх.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

*Бабруйскі раён.*

# ГАЛОЎНАЕ — НЕ НАШКОДЗІЦЬ

**Камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы, некалі створаныя пры сельвыканкамах Мінскага раёна, у хуткім часе будуць перададзеныя ў структуру раённай ЖКГ. Наколькі мэтазгодны гэты крок? Па каментарый мы звярнуліся да намесніка старшыні Мінскага райвыканкама Сяргея РУТЫ**

***— Сяргей Фадзеевіч, ці праўдзівая інфармацыя пра тое, што КУПы, якія раней падпарадкоўваліся непасрэдна сельвыканкамам, цяпер пяройдуць у сістэму жыллёва-камунальнай гаспадаркі?***

— У прынцыпе, так. Над гэтым пытаннем наш райвыканкам разам з Мінскім аблвыканкамам якраз цяпер працуе. Сёння на тэрыторыі раёна існуюць два самастойныя камунальныя прадпрыемствы, адно з цэнтрам у пасёлку Гатава, другое ў Заслаўі. У дадатак пры сельвыканкамах дзейнічаюць свае невялікія камунальныя прадпрыемствы, якія выконваюць там пэўны комплекс работ па добраўпарадкаванні. Мы сапраўды разглядаем магчымасць «улівання» гэтых КУПаў у нашу жыллёва-камунальную гаспадарку.

***— Пры пэўных рэарганізацыях, новаўвядзеннях самы галоўны прынцып — не нашкодзіць. У некаторых сельсаветах КУПы вывозяць да 50 працэнтаў смецця, наводзяць парадак на грамадскіх і прыдамавых тэрыторыях. Дапусцім, сёння вы перададзіце КУПы ў структуру ЖКГ, а заўтра нехта патэлефануе, папросіць абкасіць участак?.. Ці будзе гатовы жылкамгас выканаць заказ?***

— Вы правільна заўважылі — да гэтага пытання трэба падыходзіць менавіта з пазіцыі «не нашкодзь». Мы днямі абмяркоўвалі тэму рэфармавання раённай ЖКГ у губернатара вобласці. Пакуль што — падкрэсліваю, рашэнне яшчэ не канчатковае — разглядаюцца два варыянты. Першы — КУПы ўвальюцца ў раённую ЖКГ, але на іх месцах з'явяцца новыя структуры, з тымі ж паўнамоцтвамі, і будуць займацца тымі ж напрамкамі дзейнасці, што і раней. Толькі падпарадкоўвацца будуць жылкамунгасу, а не сельвыканкаму, таму што ў сельвыканкама, пагадзіцеся, зусім іншыя функцыі.

Але хочацца пайсці яшчэ далей. Разглядаецца пытанне аб стварэнні ў сістэме ЖКГ Мінскага раёна спецыяльнага падраздзялення па санітарнай ачыстцы. Аблвыканкам пайшоў нам насустрач, і мы атрымліваем пад гэты кірунак 20 новых машын для вывазу смецця — у дадатак да той тэхнікі, якая ўжо дзейнічае. Паралельна ў населеных пунктах будуць абуладкоўвацца кантэйнерныя пляцоўкі, для таго каб машына магла прайсці туды і цывілізавана забраць адходы і смецце. А ручная праца (тая, што існуе сёння ў невялікіх КУПах) павінна пакрысе адыходзіць.

Калі ж зазірнуць увогуле на некалькі крокаў наперад... Сёння — і пра гэта можна ўжо сказаць — разглядаецца пытанне аб зліцці нашых двух аўтаномных камунальных прадпрыемстваў (у Гатаве і Заслаўі) у адзінае цэлае.

Але тут не маецца на ўвазе стварэнне нейкага глабальнага прадпрыемства. Дакладней, галаўное прадпрыемства — з кіраўніком і інжынерна-тэхнічнымі работнікамі — будзе. Але пры ім мяркуецца стварыць тры вялікія філіялы з самастойнай фінансава-гаспадарчай дзейнасцю. Каб адзін з іх займаўся пытаннямі жыллёвага сектара, другі — водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркай, трэці — цеплавой гаспадаркай і кацельнямі. Іх забяспечаць неабходнай тэхнікай — аварыйнымі, землярыйнымі, грузапад'ёмнымі і іншымі механізмамі. І кожны пачне дзейнічаць выключна ў сваім кірунку... Плюс, як я сказаў ужо, асобнае падраздзяленне па санітарнай ачыстцы.

У гэта аб'яднанае прадпрыемства павінна ўвайсці і рамонтна-будаўнічае ўпраўленне. Яно ў нас ёсць, дзейнічае ўжо два гады, але пакуль што з'яўляецца маламоцным — там занята ўсяго 160 будаўнікоў. Гэтага відавочна мала на аб'ёмы нашага жылфонду, дзе налічваецца каля тысячы жылых дамоў... Будаўнікі возьмуць на сябе і яшчэ адзін кірунак — а менавіта работы па рамонце і добраўпарадкаванні дарог і вуліц. Для гэтага, хутчэй за ўсё, спатрэбіцца стварыць спецыяльнае звяно — моцнае, аснашчанае ўсёй неабходнай тэхнікай.

***— І калі ўсё гэта можна будзе ўбачыць у дзеянні?***

— Рэарганізацыя сістэмы ЖКГ адбудзецца ў самым хуткім часе — аб'яднанае прадпрыемства пачне працаваць па-новаму ўжо сёлета. А вось звяно па добраўпарадкаванні дарог і вуліц створым, хутчэй за ўсё, за восеньска-зімовы перыяд, і да працы яно прыступіць у наступным годзе.

***— Кожныя перамены цягнуць за сабой пэўныя цяжкасці і нязручнасці. Напэўна, старшыняў сельвыканкамаў, у якіх забяруць КУПы, чакае складаны перыяд...***

— Калі КУПы далучацца да ЖКГ, то праца, якую яны выконвалі раней, усё роўна будзе выконвацца нашым прадпрыемствам. Ну, можа, некаторыя давядзецца аб'яднаць... Затое мы іх абсталюем як след, дапаможам фінансава. А сельвыканкамы са сваімі сціплымі магчымасцямі пры ўсім жаданні зрабіць гэта не змогуць. Думаю, і ў тых жа Калодзішчах, і ў Міханавічах абавязкова застануцца нейкія камунальныя структуры. А штатны расклад будзе фарміравацца ў залежнасці ад аб'ёму работ, ускладзеных на кожную з іх.

***— Але яны будуць абслугоўваць ужо не толькі сваю тэрыторыю?***

— Так, гэта магчыма.

# У Мінску адновяць гасцініцу XIX стагоддзя

**Некалі ў доме № 11 на сталічнай вуліцы Інтэрнацыянальнай, пабудаваным у 80-я гады XIX стагоддзя, размяшчаліся мэбляваныя пакоі. Сёння вырашана аднавіць першапачатковую функцыю гэтага помніка архітэктуры і размясціць тут гасцініцу з гістарычнай назвай «Гарні».**

Як расказаў дырэктар Цэнтра па рэгенерацыі гісторыка-культурных ландшафтаў і тэрыторый Аляксандр Кропатаў, знешні выгляд будынка будзе адноўлены па старых фотаздымках у першапачатковым выглядзе. Толькі замест асобных мезанінаў, якія былі ў гасцініцы XIX стагоддзя, з'явіцца паўнавартасны мансардавы паверх. Будаўнікі адновяць страчаныя балконы, ляпны дэкор. А вось знутры будынак цалкам абновіцца. Праўда, інтэр'еры ў «Гарні», а таксама мэблю стылізуюць пад XIX стагоддзе, прычым аздабленне кожнага нумара будзе індывідуальным. З'явіцца ў гатэлі і ўтульны рэстаран у духу мінулай эпохі.

Ужо пачаўся дэмантаж канструкцый старога будынка. Скончыць рэканструкцыю дома плануецца ў кастрычніку 2011 года.

**Вольга ЖАРЫНА, «Мінск-Навіны».**

# ДАЦЬ ПРАЦУ ПА МЕСЦЫ ЖЫХАРСТВА

**Прыкладна за год пасёлак Бягомль Докшыцкага раёна прыкметна змяніўся. Па прыкладзе Бягомля, які знаходзіцца недалёка ад уезда на тэрыторыю Віцебшчыны з боку Мінскай вобласці, пачынаюць атрымліваць другое жыццё іншыя «ўязныя вароты» — населеныя пункты Прыдзвінскага края. Усяго разам з Бягомлем іх сорак. Магчымыя выказванні пра тое, што ўзорныя пасёлкі стануць «паказухай» для сталічнага начальства і замежных гасцей, лёгка абвергнуць, калі пабываць у Бягомлі. На навядзенне парадку ў гэты населены пункт ужо былі ўкладзены каля 25 мільярдаў рублёў. Працягваючы наводзіць тут прыгажосць, мясцовыя ўлады не забываюць, што для людзей важны не толькі вонкавы выгляд пасёлка, але і магчымасць знайсці тут работу.**

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр КОСІНЕЦ**, які нядаўна наведаў Бягомль, адразу адправіўся за яго межы — на шашу, у месца, дзе заканчваецца вобласць.

— Тут патрэбна збудаваць цэлы комплекс з падведзенымі інжынернымі сеткамі: з кавярняй, зонай адпачынку, крамамі. Зімой комплекс будзе ацяпляцца міні-кацельняй на мясцовых відах паліва. На шашы вельмі інтэнсіўны дарожны рух: 3,5 тысячы аўто ў суткі. Гэтым фактам трэба актыўна карыстацца. Вадзіцелі і пасажыры, калі ўбачаць сучасны пункт прыдарожнага сэрвісу, абавязкова пажадаюць спыніцца, — звярнуўся губернатар да кіраўнікоў раённых уладаў Віцебскай вобласці, камітэтаў і ўпраўленняў, якія ўдзельнічалі ў выязным пасяджэнні аблвыканкама. — І трэба, каб людзі змаглі купіць там любыя тавары, сувенірную прадукцыю. Усё, што вырабляецца ў Віцебскай вобласці: ад адзення да тэлевізараў. Усё гэта можна прадаваць у модулях. Практыка такая ў вобласці ўжо ёсць. Трэба, каб тыя ж вадзіцелі мелі магчымасць памыць бялізну, прыняць душ...

Губернатар вобласці ўпэўнены, што праз невялікі перыяд часу прыдарожныя паслугі будуць прыносіць у бюджэт да 50 працэнтаў паступленняў. Але любую справу неабходна арганізаваць. Таму няхай, лічыць ён, прыватныя структуры займаюцца стварэннем такіх комплексаў. Няхай прадпрымальнікі, напрыклад, адкрываюць кавярню. Калі ласка — яму дадуць у арэнду зямлю на 99 гадоў. Няхай і гатэль адкрываюць.

— Гасцініца для вадзіцеляў разлічана пакуль што на 16 месцаў. Ужо ў сярэдзіне верасня яна будзе функцыянаваць, — расказвае **старшыня Докшыцкага райвыканкама Алег ПІНЧУК**. — І яшчэ адзін гатэль «выхаднога дня» пачне дзейнічаць пазней. Мяркуецца, што людзі будуць прыязджаць туды на адпачынак. І дзве-тры машыны можна будзе ўзяць напракат...

Далёкія перспектывы? Губернатар паставіў канкрэтную задачу, каб ужо праз год сродкі, якія будуць укладзены ў развіццё прыдарожнага пункта, сябе акупілі. І падкрэсліў, што прыдарожны сэрвіс — гэта новыя працоўныя месцы, магчымасць для людзей зарабіць грошы.

* * *

Цэх па дрэваапрацоўцы мясцовага лясгаса цяпер працуе з рэнтабельнасцю, хоць яшчэ год таму лічыўся праблемным. Заработная плата — больш за мільён рублёў, мэта — да канца года выйсці на ўзровень зарплаты ў 1,5 мільёна. Павысіць экспарт піламатэрыялаў дазволіла набыццё новага абсталявання, у тым ліку і нямецкай вытворчасці. Цяпер цэх працуе кругласутачна і вырабляе канкурэнтаздольную прадукцыю — апрацаваную драўніну.

У лясгасе пачнуць больш актыўна зарабляць і на турызме. Насамрэч не праблема пастаўляць «зрубы» — гатэлі для турыстаў. Практыка паказвае, што нават адзін паляўнічы дамок можа быць вельмі прыбытковым (амаль увесь экспарт раёна пакуль што «трымаецца» на паляўнічым турызме). Новую прадукцыю — пелеты — пачнуць выраблясць у лясгасе ўжо ў верасні. У выніку павінна атрымацца вытворчасць без адходаў. Альтанкі, дзверы — усё гэта і не толькі можна выраблясць у лясгасе, было б жаданне.

* * *

Летась у Бягомлі задумалі знесці стары будынак былога хлебазавода, які з 1990-х не эксплуатаваўся і разбураўся. Але абласныя ўлады распарадзіліся зрабіць у ім станцыю тэхнічнага абслугоўвання і арганізаваць разліў мінеральнай вады. За шэсць месяцаў будынку літаральна далі другое жыццё. Цяпер дзякуючы сучаснаму абсталяванню тут можна адрамантаваць любое аўто. І фуры таксама. Дзейнічае шынамантаж, машыну можна памыць... У хуткім часе плануецца адкрыццё крамы па продажы запчастак... Нават не верыцца, што гаспадар сучаснага пункта для абслугоўвання аўтамабіляў — жыллёва-камунальная гаспадарка. Уклалі як уласныя сродкі, так і сродкі па лініі цэнтра занятасці, а таксама з абласнога інавацыйнага фонду... Усяго на стварэнне станцыі тэхнічнага абслугоўвання патрацілі больш за мільярд рублёў. 5,4 мільёна рублёў чыстага прыбытку атрымалі ўсяго за пару месяцаў. Прагноз — да 50 мільёнаў штомесяц. Пры такім тэмпе станцыя акупіцца гады за два.

* * *

— Менш чым за паўгода ўвялі ў эксплуатацыю новы корпус завода «Ветразь», — расказвае **дырэктар прадпрыемства «Ветразь» Анатоль СІЎКО**. — Сёння, акрамя таго, што вырабляем камплектавыя часткі для магілёўскага завода ліфтаў, пастаянна пашыраем асартымент прадукцыі. Ёсць бізнэс-план па вырабе электрарухавікоў. А італьянцы зацікавіліся адкрыццём сумеснага прадпрыемства па вырабе посуду.

Калі дырэктар паказваў прадпрыемства, у ліку іншага ўбачыў, як рабочы вырабляе цвікі. Вытворчасць іх пачалася тры гады таму — і на малым трэба зарабляць. Тыя ж цвікі попытам будуць карыстацца заўсёды, гэтаксама, як і разеткі ці выключальнікі.

Сярэдні заробак на прадпрыемстве складае 870 тысяч рублёў, але да канца года павінен дарасці да 1,5 мільёна. Створаныя і новыя працоўныя месцы — 10. А ўсяго тут занята 56 чалавек. Невялікая і мабільная вытворчасць.

Цікава, што ў старым корпусе прадпрыемства таксама запланавана адкрыццё гатэля.

* * *

Працаздольнага насельніцтва ў Бягомлі — 1400 чалавек. З іх занятыя 1137. Узровень беспрацоўя — у рамках дазволенага, але чым займаюцца астатнія людзі? Іх можна ўладкаваць на працу ў тым жа комплексе прыдарожнага сэрвісу ці на станцыі тэхабслугоўвання — пры ўмове яе далейшага развіцця.

Каб мясцовыя жыхары не ездзілі на заробкі ні ў райцэнтр, ні ў суседні Лепель, ні ў Расію, плануецца адкрыць у Бягомлі філіялы лепельскага малочнага завода, докшыцкага хлебазавода. З'явяцца працоўныя месцы на вытворчасцях па замарожванні і перапрацоўцы ягад і грыбоў. Жаданне чалавека знайсці працу па месцы жыхарства не павінна быць недасягальным...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*Бягомль — Віцебск.*

ШКОЛА ПАДАТКАПЛАЦЕЛЬШЧЫКА

# ДЭКЛАРАВАННЕ ПАЗЫКОВЫХ СРОДКАЎ

**Сёння чарговую кансультацыю па асобных пытаннях падаткаабкладання даюць спецыялісты прэс-цэнтра Міністэрства па падатках і зборах.**

**Аб адлюстраванні ў дэкларацыі аб даходах і маёмасці сумаў пазыковых сродкаў**

Згодна з артыкулам 5 Закона Рэспублікі Беларусь ад 04.01.2003 № 174-З «Аб дэклараванні фізічнымі асобамі даходаў і маёмасці» ў рэдакцыі ад 29.12.2009 (далей — Закон), якая ўвайшла ў сілу з 18.03.2010, абавязковаму дэклараванню ў выпадках і парадку, прадугледжаных Законам, падлягаюць даходы фізічных асобаў, атрыманыя на працягу каляндарнага года ад крыніц у Рэспубліцы Беларусь, а таксама ад крыніц за межамі Рэспублікі Беларусь. Для мэтаў прымянення Закона да даходаў адносяцца любыя грашовыя сродкі, у тым ліку пазыкі, а таксама іншая маёмасць, атрыманыя фізічнымі асобамі ад грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян, асобаў без грамадзянства і арганізацый.

Звяртаем увагу, што пры падачы фізічнымі асобамі дэкларацый аб даходах і маёмасці пасля 18.03.2010, у такіх дэкларацыях акрамя звестак пра пазыкі і крэдыты, атрыманыя ў дэкларуемы перыяд, у абавязковым парадку называюцца таксама пазыкі, атрыманыя за перыяд, які папярэднічаў перыяду, за які падаецца дэкларацыя аб даходах і маёмасці, і не вернутыя на дату падачы дэкларацыі.

**Аб вызначэнні падатковай базы пры атрыманні фізічнымі асобамі даходаў у выглядзе аплаты працы ў замежнай валюце**

Згодна з дзейным заканадаўствам, падаходны падатак з фізічных асобаў выплачваецца ў бюджэт у беларускіх рублях незалежна ад валюты атрымання даходу.

Пунктам 6 артыкула 156 ПК вызначана, што даходы плацельшчыка, атрыманыя ў замежнай валюце, пералічваюцца ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, устаноўленым Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату фактычнага атрымання даходаў.

У мэтах вылічэння падаходнага падатку, у адпаведнасці з п.п. 1.10 артыкула 172 ПК, датай фактычнага атрымання даходу ў выглядзе аплаты працы з'яўляецца апошні дзень месяца, за які плацельшчыку быў налічаны даход за выкананне працоўных абавязкаў у адпаведнасці з працоўным дагаворам (кантрактам).

На практыцы ўзнікаюць сітуацыі, калі выплата такога даходу ажыццяўляецца на працягу месяца, за які ён налічваецца.

Пры выплаце адпускных, налічаных у дазволеных заканадаўствам выпадках у замежнай валюце (напрыклад, выплата адпускных замежнай арганізацыяй, якая ажыццяўляе дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праз пастаяннае прадстаўніцтва), падатковыя агенты ўтрымліваюць налічаны падаходны падатак з гэтых даходаў пры іх фактычнай выплаце. Пры гэтым для вызначэння падатковай базы варта кіравацца п.п. 1.1 артыкула 172 ПК, а менавіта даходы плацельшчыка падлягаюць пераразліку ў беларускія рублі па афіцыйным курсе, які ўстаноўлены Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату выплаты даходу (у тым ліку пералічэння даходу на рахункі плацельшчыка ў банках або па яго даручэнні на рахункі трэціх асобаў). У далейшым пераразлік падаходнага падатку не ажыццяўляецца.

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
Газета для выбарнікаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»
**Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.**
**Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.**
Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, дэпутат Смалявіцкага раённага Савета дэпутатаў Мінскай вобласці
**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 21 03;
**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**
**Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.**

# САМАЯ ЦІКАВАЯ І САМАЯ ПАЧЭСНАЯ СПРАВА

## Наш рэпартаж з Бабруйскага завода буйнапанэльнага домабудавання


1.

**Папрыгажэў за апошнія гады Бабруйск, з'явіліся ў ім новыя вуліцы і праспекты, цікавыя арыгінальныя пабудовы і архітэктурныя ансамблі дамоў. Кажуць, што ўсё гэта дзякуючы таму, што некалі ў горадзе былі праведзены рэспубліканскія дажынкі: вось і паднавілі яго, і надалі яму даволі прывабны выгляд. Можа, і так гэта. Але разам з тым удакладнім: да ўсёй гэтай прывабнасці і прыгажосці, безумоўна, прыклалі руку працаўнікі Бабруйскага завода буйнапанэльнага домабудавання (БПД). У кожным горадзе ёсць свае, так бы мовіць, знакавыя, адметныя прадпрыемствы. У Бабруйску да такіх прадпрыемстваў адносіцца, безумоўна, і завод буйнапанэльнага домабудавання. Ды і не магло быць інакш: ці не палова бабруйчан жыве ў дамах, узведзеных калектывам завода БПД.**

**Нагадаем: у першую нядзелю жніўня (а сёлета гэта будзе 8 жніўня) будаўнікі краіны адзначаюць сваё прафесійнае свята — адсюль добра зразумелыя і мэта нашага візіту ў Бабруйск, на завод буйнапанэльнага домабудавання, і наш перадсвяточны расказ пра цяперашнія справы яго калектыву.**


3.

### З чаго павінна пачынацца новабудоўля?

Напэўна, нямала ў каго любая новабудоўля асацыюецца з граззю на будаўнічай пляцоўцы, з раскіданымі па ёй канструкцыямі і іншымі падобнымі на ўсё гэта прыгажосцямі... «Лапцеў, пазвані ў швейны цэх, няхай там абрусы ды фіранкі аддаюць», — чулася на будаўнічай пляцоўцы, па вуліцы Ульянаўскай, калі мы наведалі яе, дзе будаўнікі Бабруйскага завода БПД закладвалі новы 144-кватэрны 9-павярховы дом. Калі паслухаць кіраўніка завода Івана Грыняка, яго намесніка Вадзіма Кулікова ды іншых спецыялістаў, адказных тут за будаўніцтва, здавалася, увесь іх клопат і быў скіраваны менавіта толькі на тое, каб у бытавых памяшканнях, прызначаных для будаўнікоў дома, віселі фіранкі; ды каб яшчэ былі пракладзены пешаходныя дарожкі, ды побач разбіты кветнікі, ну і гэтак далей.

Адметная дэталь: на пляцоўцы былі ўзведзены (няхай прабачыць чытач за такія падрабязнасці) самыя што ні ёсць цывілізаваныя прыбіральні («М» і «Ж») — з пліткай усярэдзіне і з адпаведным водазабеспячэннем. «Падключыліся да гарадскіх сетак, і прыборы ўліку ўстанавілі», — паведамілі на новабудоўлі. Тыя ж бытоўкі, прыбіральні, памяшканне, дзе можна памыцца, з'явіліся на пляцоўцы, па сутнасці, у першую чаргу. Ва ўсякім разе, тут, падчас нашага візіту, яшчэ толькі закладваўся фундамент будучага дома, а адзначаныя аб'екты ўжо стаялі. Між іншым, вельмі пашанцуе тым бабруйчанам, якія будуць жыць у гэтым доме: будаўнічую пляцоўку акружаў хваёвы лес, водар якога так прыемна адчуваўся ў спякоту душнага ліпеньскага дня. Ну, а да канца года ў доме абавязкова павінны адбыцца наваселлі: звычайны тэрмін узвядзення жылых дамоў складае ў працаўнікоў Бабруйскага завода БПД 5-6 месяцаў, пры нарматыўным тэрміне — 9. Прычым гэта самае што ні ёсць сучаснае жыллё: з больш зручнай, чым раней, планіроўкай, з прасторнымі кухняй (не менш за 9 квадратных метраў) і ванным пакоем, больш шырокімі калідорамі, з прыгожымі закрытымі лоджыямі. Дарэчы, аконныя блокі — з моднага цяпер у краіне пластыку, з трайным шкленнем...

Вядома, гэта не факт, што ўжо цяпер кожнага з нас задаволіць тая ж 9-метровая кухня, хацелася б і паболей. Але ёсць пэўныя агульнапрынятыя спажывецкія характарыстыкі жылля, прымальныя менавіта на сёння — на лепшае з таго, што прапаноўвае час, ды на сучасныя метады домабудавання, увогуле на лепшыя, прагрэсіўныя тэндэнцыі ў айчынным і замежным домабудаванні і арыентуюцца на Бабруйскім заводзе БПД, і гэты факт не выклікае сумненняў. Прычым гэта ўжо — добра ўстойлівая традыцыя: Бабруйскі завод БПД ужо даўно адносіцца да ліку лепшых домабудаўнічых арганізацый краіны, якім заказчыкі давяраюць у поўнай меры. Варта тут нагадаць асобныя ўзведзеныя ім аб'екты. А гэта, напрыклад, жылыя дамы ў мінскай, так званай алімпійскай вёсцы для беларускіх спартсменаў, 8-я гінекалагічная бальніца ў Мінску ж, прыгожыя сучасныя жыллёвыя комплексы, якія ўтвараюць цэлыя новыя кварталы і вуліцы, непасрэдна ў самім Бабруйску, у прыватнасці ў новым гарадскім мікрараёне Заходні, дзе найбольш за ўсё і «адзначыліся» менавіта будаўнікі з завода БПД. Гэта таксама дамы ў Магілёве, які вызначаецца сваім непаўторным, цікавым архітэктурным аблічча́м (а ў ім бабруйчане, акрамя свайго горада, будуюць больш за ўсё), і ў многіх іншых гарадах краіны; гэта жылыя дамы ў расійскім Калінінградзе, дзе, аказваецца, таксама добра ведаюць пра бабруйскіх домабудаўнікоў. А сёлета, дарэчы, яны атрымалі заказ на ўзвядзенне шматкватэрнага дома ў Смаленску. І гэта ўжо няблага сведчыць пра экспартныя магчымасці калектыву.

У бабруйскіх домабудаўнікоў з завода БПД ёсць свой, уласцівы ім стыль, яны ўмеюць нават з даволі жорсткіх магчымасцяў буйнапанэльнага домабудавання «выціснуць» максімум арыгінальнага. Што ў гэтым стылі яўна прыкметнае? У прыватнасці звонку? Гэта абуладкаванне так званых фальшдахаў (свайго роду дэкаратыўных канструкцыйных элементаў), гэта «гульня» колерам; нярэдка дамы завода БПД можна пазнаць і па іх пераменнай павярховасці.


2.

— А паедзем, пакажам вам нашу «іскрынку», — прапанавалі нам на заводзе БПД, маючы на ўвазе не так даўно здадзены і ўжо заселены жылы дом па Георгіеўскім праспекце. Ён тут працягнуўся, уздоўж праспекта, метраў на 200 і, сапраўды, са сваімі фальш-дахамі, аркамі і іншымі архітэктурнымі тонкасцямі выглядаў вельмі прыгожа. «Праектавала адна з прыватных фірмаў», — паведамілі спецыялісты завода. Зрэшты, нашу ўвагу прыцягнуў і побач размешчаны цікавы жыллёвы ансамбль. «А тут хто праектаваў?» — запыталіся мы. «А тут — «Магілёўграмадзянпраект»... Што ж, як тыя, так і другія праектанты, яўна, вельмі няблага пашчыравалі над сваімі творчымі праектамі ды эскізамі, але ж як важна было ўдыхнуць у гэтыя праекты і эскізы сапраўднае жыццё. У працаўнікоў Бабруйскага завода БПД атрымалася гэта ў поўнай меры.

Ужо ўзведзеныя калектывам завода дамы жывуць сваім самастойным жыццём, але (вось адметная асаблівасць) іх стан працягвае хваляваць заводскіх спецыялістаў і пасля. «Вы паглядзіце, — казалі яны, — як папсавалі свае лоджыі асобныя жыхары-«рацыяналізатары». А нехта ж недасведчаны скажа, гледзячы на ўсё гэта: «неахайныя будаўнікі»... Аднак гэта, так бы мовіць, ужо на заўвагу жыллёва-эксплуатацыйным арганізацыям, менавіта яны і павінны ацэньваць падобную рацыяналізатарскую творчасць належным чынам.

* * *

Напэўна, пра гэта варта было сказаць на самым пачатку: летась працаўнікі Бабруйскага завода БПД здалі 106,8 тысячы квадратных метраў і ўпершыню за час свайго існавання перавысілі праектную магутнасць (яна складае 106 тысяч метраў). Прасочым тут адпаведную дынаміку за апошнія гады: у 2007 годзе было здадзена 58 тысяч квадратных метраў, у 2008-м — 71 тысяча; у гэтым жа годзе плануецца здаць не менш за 110 тысяч квадратных метраў. А гэта — каля 2 тысяч новых кватэр, каля 2 тысяч наваселляў — такіх жаданых для тых, хто стаіць у добра вядомай чарзе.

І яшчэ на адну вельмі важную асаблівасць звернем увагу: жыллё, узведзенае бабруйскімі будаўнікамі з завода БПД, з'яўляецца ці не адным з самых танных у краіне — адзін квадратны метр каштуе прыкладна 350 так званых умоўных адзінак (без уліку выдаткаў заказчыка). Аднак адкуль такі вельмі цікавы кошт? На заводзе называюць некалькі фактараў. Адзін з іх, можа, найбольш важны: тут усё робяць — ад абуладкавання фундаментаў і да здачы дома «пад ключ» — менавіта самі, сваімі сіламі, не прыцягваючы для гэтага іншыя арганізацыі. На заводзе ёсць і свая сантэхнічная група, і электрамантажны ўчастак і г.д., а на ўсе віды работ — адпаведныя ліцэнзіі. А плюс да гэтага калектыў завода БПД узводзіць дамы са сваіх жа, выраблених непасрэдна ў сябе на прадпрыемстве, канструкцый. Па сутнасці, усё тут, што патрэбна для ўзвядзення і здачы гатовага дома, — сваё. Тры гады таму тут пачалі вырабляць нават свае пластыкавыя аконныя блокі. «Тэхналогія не такая ўжо складаная, — заўважыў начальнік цэха ПВХ Аляксей Кароткі, — раніцай сыравіна — увечары гатовыя вокны».

І яшчэ адзін вельмі важны фактар (і ён ужо называўся вышэй): бабруйчане будуюць у надзвычай сціслыя тэрміны, а як вядома, расцягванне будаўніцтва непазбежна вядзе да павелічэння кошту ўсіх работ. Што дапамагае будаваць хутка? І пра гэта таксама ўжо, па сутнасці, сказана: высокая арганізаванасць на новабудоўлі і вельмі карпатлівая, дэталёвая падрыхтоўка да яе. Ну, а кошт жылля ды яго якасць — гэта, па сутнасці, два галоўныя фактары, якія і ўплываюць на выбар заказчыкам той ці іншай будаўнічай арганізацыі. Што датычыцца якасці будучага жылля, яна закладваецца яшчэ непасрэдна на фармовачных канвеерах. Пры гэтым прадпрыемства мае два аддзелы якасці, якія ўважліва сочаць за належным выкананнем усіх тэхпрацэсаў і будаўнічых нормаў як на самім заводзе, пры вырабе жалезабетонных элементаў будучых дамоў, так і на будоўлях.

* * *

**З ГІСТОРЫІ ПРАДПРЫЕМСТВА.** Бабруйскі завод буйнапанэльнага домабудавання створаны ў 1978 годзе, на першым часе з'яўляўся структурным падраздзяленнем Бабруйскага домабудаўнічага камбіната і працаваў пераважна на яго патрэбы. Ужо ў хуткім часе стаў у домабудаўнічай індустрыі краіны свайго роду палігонам па выпрацоўцы найбольш эфектыўных метадаў гаспадарання. У канцы 80-х гадоў з мэтай павышэння эфектыўнасці працы і атрымання гаспадарчай самастойнасці перайшоў на арэндныя адносіны, а на пачатку 90-х гадоў аддзяліўся ад домабудаўнічага камбіната і стаў цалкам самастойным прадпрыемствам (гэты крок быў прадыктаваны адсутнасцю заказаў з боку домабудаўнічага камбіната, словам — трэба было выжываць). Пры гэтым тут, на заводзе, стварылі свае будаўнічыя падраздзяленні, а ў выніку сталі са сваіх жа канструкцый узводзіць дамы. Вопыт работы калектыву завода БПД неаднойчы абмяркоўваўся на розных рэспубліканскіх нарадах і семінарах. Вось што пра завод пісалі па выніках аднаго з такіх семінараў: «Вялікі вопыт эфектыўнай работы назапашаны прадпрыемствам «Бабруйскі завод індустрыяльнага домабудавання». З мэтай павышэння спажывецкіх якасцяў прадукцыі тут распрацаваны прапановы па паляпшэнні аб'ёмна-планіровачных рашэнняў жылых дамоў. Вядзецца актыўны пошук заказчыкаў за межамі Бабруйска і Магілёўскай вобласці. Прадпрыемства будуе дамы ў іншых гарадах, у тым ліку і ў Мінску. Тут арганізавана вытворчасць пенаполістыролу, сталярных вырабаў, дробнаштучных сценавых вырабаў, створаны парк спецыялізаванага аўтатранспарту, які дазваляе весці мантаж з колаў (варта ўдакладніць: метад такога будаўніцтва — «мантаж з колаў» некалі быў вельмі папулярны ў будаўнікоў і ўсяляк прапагандаваўся). Вялікія сродкі ўкладзеныя ў мадэрнізацыю асноўных фондаў...»


4.


7.

Напэўна, варта на гэтым спыніцца і яшчэ раз нагадаць: так пісалі пра Бабруйскі завод БПД, падчас абагульнення яго вопыту работы, у 90-х гадах мінулага стагоддзя. А тая ж мадэрнізацыя, па сутнасці, працягваецца і сёння. І з нашмат большым размахам. За апошнія гады тут, як зазначалася ўжо, асвоены выпуск пластыкавых вокнаў, праведзена маштабная мадэрнізацыя растворабетоннага вузла (з поўным выключэннем з працэсу, як зазначалі на заводзе, так званага чалавечага фактару: асноўнае ў гэтым працэсе — дазіраванне пэўных кампанентаў раствораў, — яго ўзяла на сябе аўтаматыка); набытыя новыя вежавыя краны, а таксама іншыя грузападымальныя механізмы, аўтамабільная і землярыйная тэхніка (усяго тут гэтай тэхнікі больш за 160 адзінак, прычым каля года таму завод купіў сваю аўтабазу, дзе гэта тэхніка будзе захоўвацца і рамантавацца, — цяпер тэрыторыя аўтабазы і яе рамонтныя майстэрні прыводзяцца ў належны выгляд); выкананыя некаторыя іншыя арганізацыйна-тэхнічныя мерапрыемствы. Падчас экскурсіі па заводзе нам таксама расказвалі і паказвалі: на ім цяпер заканчваюцца работы па ўкараненні зваротнага водазабеспячэння (ад гэтага, паводле разлікаў, калектыў будзе мець 30 мільёнаў рублёў штомесячнай эканоміі); тут актыўна выкарыстоўваюць падчас фармавання спецыяльныя хімічныя рэагенты, што скарачае час і тэмпературу прапарвання вырабаў (адпаведна, таксама эканомія энергарэсурсаў); рыхтуецца замена цяперашняму пенаполістыролу, які закладваецца ў сценавыя панэлі ў якасці ўцяпляльніка (на замену яму прыйдзе больш эфектыўны матэрыял, з больш нізкай цеплаправоднасцю); да канца года будзе праведзена поўная рэканструкцыя арматурнага цэха, якая каштуе каля 1,5 мільёна еўра... Увогуле, для завода рыхтуецца праект яго поўнай мадэрнізацыі, што надасць яго вытворчасці зусім іншы, цалкам сучасны тэхнічны ўзровень, а яго вырабам — яшчэ большую якасць і надзейнасць, узведзеным дамам — арыгінальнасць. Як зазначалі на прадпрыемстве, у яго мадэрнізацыю ўжо ўкладзена каля 20 мільярдаў рублёў, яшчэ плануецца выдаткаваць каля 70 мільярдаў. Пры ўсім гэтым варта падкрэсліць: мадэрнізацыя завода ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Дзяржаўнай комплекснай праграмай развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы будаўнічай галіны на 2006—2010 гады. Вынікі гэтай мадэрнізацыі павінны вывесці прадпрыемства на ўзвядзенне 150 тысяч квадратных метраў жылля за год пры 3-зменным рэжыме працы, або на 120 тысяч «кубоў» зборнага жалезабетону.

...Падчас таго, як нас знаёмілі з работай цалкам мадэрнізаванага, па сутнасці, новага растворабетоннага вузла (праўда, кіраўнікі завода пры гэтым пералічвалі: вось яшчэ плітку трэба тут пакласці, абшыць сцены панэлямі і г.д. — каб людзям было працаваць больш зручна), начальнік РБУ Людміла Саковіч паскардзілася: «Вось вельмі душна ў нас, кандыцыянеры б не пашкодзіла паставіць», на што кіраўнік завода цвёрда пааб'яцаў: «Будзем ставіць».

### «Самая цікавая і самая пачэсная справа»

**Калектыўнае інтэрв'ю, складзенае з адказаў спецыялістаў завода**

***— Бабруйск — ваша асноўная будаўнічая пляцоўка. Дзе завод будуе яшчэ?***

— Да канца года плануецца здаць каля 70 тысяч квадратных метраў у Бабруйску, каля 10 тысяч у Мінскай вобласці, 22 тысячы — у Магілёўскай вобласці (у Касцюковічах, Клічаве і іншых гарадах), 12 тысяч квадратных метраў — у Асіповічах.

***— Будаваць было лягчэй раней ці цяпер?***


5.


6.

— Будаўніцтва заўсёды было нялёгкай справай. Але ёсць свае прыкметы часу: раней нялёгка было знайсці заказы, сёння ж — часам не паспяваем за імі, не хапае магутнасцяў, вымушаны працаваць на новабудоўлях нават у тры змены. Разам з тым, як раней, так і цяпер лічым сваю справу самай цікавай і самай пачэснай. Вельмі дапамагае цяперашняя пільная дзяржаўная ўвага да пытанняў жыллёвага будаўніцтва.

***— Колькі чалавек працуе на заводзе, колькі яны зарабляюць?***

— Усяго, ва ўсіх падраздзяленнях, працуе каля 1550 чалавек. За апошні месяц сярэдняя заработная плата па заводзе перавысіла паўтара мільёна рублёў.

***— У вашым кадравым складзе ёсць так званыя абавязаныя — што гэта за людзі?***

— Нам даводзяць так званыя квоты працаўладкавання тых людзей, якія не выхоўваюць сваіх дзяцей. Нельга сказаць, што нам гэта вельмі падабаецца, тым не менш, нават маем вельмі добрыя прыклады перавыхоўвання ўжо непасрэдна саміх такіх бацькоў.

***— Буйнапанэльнае домабудаванне некалі аб'явілі зусім неперспектыўным і амаль што па-за законам. Як можна меркаваць цяпер, такая думка была памылковай?***

— Абсалютна так. А наконт неперспектыўнасці сказалі ў гады перабудовы: маўляў, буйнапанэльнае домабудаванне вычарпала сябе. Маўляў, пры ім мы маем вельмі жорсткія планіроўкі і халодныя кватэры. Тым не менш нават пры пэўных абмежаваных магчымасцях буйнапанэльнага домабудавання можна ў ім таксама дасягнуць добрай архітэктурнай разнастайнасці. Трэба толькі, каб архітэктары выказвалі больш настойлівасці пры прыняцці пэўных прапаноў ад праектантаў, якім, зразумела, лягчэй «прывязаць» да мясцовасці тыпавы праект. А цяпер адносна цеплавых характарыстык такіх дамоў: каэфіцыент іх цеплаправоднасці, напрыклад, у нас, складае цяпер 2,6, але ўжо хутка мы павінны выйсці на 3,2. Гэта вельмі добры паказчык, і мы збіраемся палепшыць яго яшчэ больш. Ну, і нарэшце не будзем забываць: буйнапанэльнае домабудаванне як было, так і застаецца на сёння самым танным і самым хуткім.

***— Ці можа непасрэдна сам завод уплываць на прыняцце тых ці іншых архітэктурных рашэнняў? Вы ж, як проста будаўнікі, па сутнасці, выключаныя з гэтага працэсу...***

— Не зусім так. Мы актыўна ўмешваемся ў гэты працэс і далёка не заўсёды згодныя з тым, што нам прапануюць праектанты і архітэктары. Увогуле, гэты працэс — праектаванне і ўзвядзенне дамоў — агульнатворчы, усіх нас павінна хваляваць, каб мы ўзвялі не проста ўтульнае і зручнае жыллё, але і прыгожыя непаўторныя жыллёвыя кварталы і ансамблі. Мы не павінны пакідаць пасля сябе шэрасць і безаблічнасць.

***— Раней існавала практыка абавязкова здаць пэўны будаўнічы аб'ект да нейкай даты, а потым пачыналася напружаная праца над недаробкамі. Вы да Дня будаўніка нічога не здаяце?***

— Не. І практыка гэта (дарэчы — цалкам заганная) ужо даўно адышла ў мінулае. Будаўнічая справа — вельмі адказная, і трэба рабіць яе хоць і вельмі хутка, але без лішняй мітусні.

* * *

**На заканчэнне.** Далёка не ўсё змясцілася ў рамкі гэтага рэпартажу. Напрыклад, гэта датычыцца пытанняў сацыяльна-культурнага зместу з жыцця калектыву. Так, нам з гонарам паведамілі, што на заводзе, на яго стадыёне, не так даўно быў праведзены тыдзень футбола, маўляў, натхніў чэмпіянат свету. Тут таксама маюць вельмі важкі так званы сацыяльны пакет, магчымасць даволі хутка пабудаваць сваё ўласнае жыллё... Зразумела, усе адпаведныя сацыяльныя даброты трэба зарабіць. І яны зароблены працаўнікамі Бабруйскага завода буйнапанэльнага домабудавання, якія любяць і шануюць сваю надзвычай пачэсную справу. Дарэчы, калі мы спыталіся ў намесніка кіраўніка завода Вадзіма Кулікова, што асноўнага ў далейшых планах калектыву, той адказаў вельмі коратка: «Працаваць, працаваць і працаваць!».

**Іван БАРАНОЎСКІ.**

**На здымках:**
**1.** Навінка: дом з цікавымі архітэктурнымі асаблівасцямі. Гэтым домам ганарацца на прадпрыемстве.
**2.** Дамы па вуліцы Гогаля, мікрараён «Заходні».
**3.** Аддзелачніца Еўдакія АПАРЫНА.
**4.** Сярод сосен ды бяроз закладваецца 144-кватэрны дом па вул. Ульянаўскай.
**5.** Брыгадзір Пётр КЛЕЙНАЎ і старшы вытворца работ Віталь ЛАПЦЕЎ на закладцы новага жылога дома.
**6.** На новай будаўнічай пляцоўцы ў першую чаргу ўзводзяцца аб'екты бытавога і санітарна-гігіенічнага прызначэння.
**7.** Намеснік дырэктара па ідэалогіі Вадзім КУЛІКОЎ і старшы майстар фармовачнага цэха Уладзімір УЛАСЕНКА на складской пляцоўцы гатовай прадукцыі.
**8.** Адзін з куткоў горада Бабруйска, у абуладкаванні якога прымалі ўдзел і прадстаўнікі завода БПД.
**9.** Начальнік цэха ПВХ Аляксей КАРОТКІ і майстар участка Віталь ЛАЗАРЭНКА.
**10.** Станочнік Міхаіл ШЫРОКІ.
**11.** Вадзіцель панэлевоза Міхаіл КАЗЛОЎСКІ.
**12.** У фармовачным цэху. На здымку фармоўшчык Алег ЯНЫБАЕЎ.

**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

*УНП 700016179*


8.

**З Днём будаўніка вас, працаўнікі завода!**
**Няхай узведзенае вамі жыллё ўпрыгожвае нашы гарады, радуе нашых людзей і служыць ім вельмі доўга!**


9.


10.


11.


12.

## Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 27 (359)

# Праца на дачы ў радасць

Відаць, трэба моцна любіць зямлю, і тое, што ты на ёй пасадзіў, каб у такую гарачыню атрымаць важкі ўраджай. На дачы ў вёсцы Зоі Якаўлеўны Філімонавай (а дачны ўчастак знаходзіцца на беразе Заходняй Дзвіны, за 12 кіламетраў ад абласнога цэнтра), работа кіпіць з ранку да вечара. Пакуль сонца не ўзышло высока, трэба паліць агурочкі, моркваўку, жоўтыя маладзенькія кабачкі, якія кучкай месцяцца пад шырачэннымі лістамі і таксама просяць піць. А як жа не задаволіць гэту просьбу, бо аладкі з кабачкоў вельмі ўжо любіць унучка, трохгадовая Маргарыта, якая ходзіць за бабуляй і пытаецца, ці не прамінула яна чагосьці, ці ўсіх напаіла, ці не забыла пра памідоры, якія таксама любяць есці з градкі, асабліва маленькія. Добра што вада тут ужо бяжыць са шланга і не трэба бегчы ў хату, каб памыць. А вада для агарода з той самай Заходняй Дзвіны. Увечары зноў пачынаецца паліў, калі сонца ўжо садзіцца. Усё жывое радуецца, буяе і дзякуе гаспадыні за клопат. Ніякіх экзатычных раслін на агародзе няма, усё звычайнае, што спатрэбіцца ў зімовы час.

— Кавуны, дыні можа выспелі б і ў нас, асабліва сёлета, калі наш паўночны край краіны б'е ўсе рэкорды па гарачыні, — кажа Зоя Якаўлеўна, — але ж патрэбен час і ўвага гэтым экзотам, а ў мяне толькі два выхадныя. Кожны дзень мяне чакае любімая работа — бібліятэкара Галоўнай бібліятэкі Віцебскай Епархіі. Дзеці крыху дапамагаюць ды вось унучка Маргарытка, якая патрабуе не меншай увагі.

А вось агуркоў нарасло вельмі многа, кажа гаспадыня, нарыхтавалі на зіму так шмат, што хопіць усім. З канца чэрвеня Зоя Якаўлеўна збірае кожны дзень па кошыку агуркоў. Агарод садзіць рана, цыбулю, напрыклад, садзіла перад Вялікаднем, таму з канца мая — пачатку чэрвеня ўжо пакрысе збірае ўраджай. Ладныя галоўкі цыбулі і статны часнок выбраны ўжо ў трэцяй дэкадзе ліпеня, ляжаць на градцы і чакаюць, калі гаспадыня іх пасартуе. А вараная бульба з агарода гаспадыні, скажу шчыра (В.Ш.), такая смачная і сопкая, што можна есці без масла і малака.



— Ой, бабуля Зоя, трымай мяне мацней, бо на гэтым «калабку» мы пакоцімся з твайго агарода, — кажа Маргарытка.

— Гэта не «калабок», а гарбуз, — смяецца бабуля, — якому расці яшчэ два месяцы. Вось тады мы з табой яго дакладна не кранём з месца!

— Хоць зямля ў нас не вельмі ўраджайная — пясок, — кажа Філімонава, — мы ўвогуле не карыстаемся мінеральнымі ўгнаеннямі. І наогул на агародзе прынцыпова не прымяняем ніякай хіміі. Некалі была магчымасць навазіць шмат гною, перамяшалі з прыроднай зямлёй — цяпер яна ў нас нібы пух. Ды і хваробы раслін нас абыходзяць. Усё даецца лёгка і ў радасць.

Калі пачынаецца пасяўная, святар па просьбе прыхаджан, настаяцель храма Вялікамучаніцы Святой Кацярыны, што ў цэнтры Віцебска, айцец Мікалай служыць малебен на добры ўраджай, дзе таксама асвячаецца і насенне. Чытаецца малітва перад абразом «Спарыцельніца хлябоў», якая дапамагае ў земляробчых работах. Зоя Якаўлеўна лічыць, што на агародах усё расце з міласці Божай і дзякуючы тым малітвам, у якіх гэтага просяць агароднікі. Гэта дае імпульс і зарад працаваць на дачы з ахвотай і з вялікай аддачай.

*Мінск—Віцебск—Мінск.*

# Той зімой галадае, хто ў жніўні гуляе

**Спее ўраджай садавіны і агародніны, сад патанае ў кветках. Якая цудоўная пара! Але нельга толькі бесклапотна сузіраць, бо зіма спагоніць строга. Таму ў жніўні працягваюць паліваць і рыхліць глебу, падкормліваць расліны, весці барацьбу са шкоднікамі і хваробамі, якія ў гэтым месяцы асабліва лютуюць. У ясныя дні і пасля 10 гадзін раніцы збіраюць паспелае насенне. Менавіта ў жніўні робяць большасць запасаў ягад, агародніны на зіму.**

У садзе ў жніўні пладовыя дрэвы заканчваюць рост. Для павышэння іх зімастойкасці ў пачатку жніўня падкормліваюць фосфарна-калійнымі ўгнаеннямі альбо попелам.

Вішню апырскваюць 1-працэнтным растворам сернакіслага калію: гэта спрыяе лепшай закладцы пладовых пупышак будучага ўраджаю.

Настаў лепшы час для пасадкі суніц садовых (клубніц), расаду якіх высаджваюць на падрыхтаваныя ўчасткі да 10 верасня, інакш расліны не паспеюць укараніцца да надыходу замаразкаў.

У жніўні, калі не паспелі ў ліпені, працягваюць акуліроўку (прышчэпку вочкам) вішні, слівы, грушы, і заканчваюць гэту працэдуру ў першай дэкадзе месяца. Пачынаюць акуліроўку яблыні. Рух соку яшчэ даволі моцны, а каб вынікі былі больш надзейнымі, прышчапіць трэба ў прыклад.

У агародзе ў жніўні поўным ходам ідзе ўборка паспелых кабачкоў, патысонаў. Каб яны не падгнівалі, пад іх можна пакласці кавалкі фанеры ці дошкі. Кожныя пяць дзён збіраюць буйныя плады перцу, не чакаючы пакуль яны пачырванеюць. У зялёных пладах больш вітаміну С, а ў чырвоных — караціну. У цёплым месцы зялёныя плады хутка мяняюць фарбоўку. Захоўваюць перац у халаднаватым памяшканні (у халадзільніку — да месяца), у цёплым ён хутка вяне. На расліны перцаў часта нападае тля, якая селіцца на ніжняй частцы ліста, высмоктваючы сокі. Ліст згортваецца і падае — тады тля пераходзіць на сцёблы і нават плады. Калі вы заўважылі на вашым агародзе такую непрыемную карціну, адразу паліце расліны і па вільготных лісціках прыпудрыце попелам, стараючыся трапіць на ніжнюю частку ліста. Праз 20 хвілін глебу прарыхліце, знішчаючы насякомых, якія зваліліся з расліны. Пры неабходнасці апрацоўку паўтарыце праз 3—5 дзён. На будучыню: па краях градкі з перцам высаджвайце аксаміткі, якія адпалохваюць тлю.

У сярэдзіне жніўня спыняюць паліў таматаў, каб паскорыць выспяванне пладоў.

Белакачанная капуста сярэдніх і позніх гатункаў патрабуе частага і рэгулярнага паліву, рыхлення і акучвання, інакш галоўкі атрымліваюцца дробнымі і рыхлымі. Калі не хапае вільгаці, лісты капусты пакрываюцца сівым налётам і набываюць ружовае адценне. У ранняй капусты затрымліваецца рост, утвараецца маленькі качан, а ў квяцістай завязваецца нестандартная галоўка, якая хутка жаўцее і развальваецца. Але і лішак вільгаці таксама адмоўна адбіваецца: прыпыняецца рост капусты, што прыводзіць да фарміравання дробных качаноў і галовак. Так што шукайце залатую сярэдзінку.

Да 10 жніўня ў парнікі сеюць круглую радыску, салату латук, кервель, дайкон, рэдзьку. У другой палове жніўня не позна пасеяць яшчэ раз кроп, пекінскую капусту, ліставую салату, ліставую гарчыцу. У гарачае надвор'е пасевы трэба прыцяніць, лепш накрыць якім-небудзь нятканым матэрыялам, а ў халаднаватае — нацягнуць плёнку на дугах, не закрываючы з тарцоў.

У кветніку высаджваюць касачы, флёксы, півоні і іншыя шматгадовыя кветкі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)








**РОЎНА месяц застаецца да Дня беларускага пісьменства, які сёлета пройдзе на зямлі Івана Мележа. Месяц — гэта не так ужо і мала. Але жыхары горада адлік вядуць на дні і нават гадзіны. Паспрабуй змяні аблічча населенага пункта за якіясьці трыццаць дзён. Таму кожны дзень для Хойнікаў цяпер — імклівая трансфармацыя старога правінцыйнага ў прывабны, з самым сучасным тварам населены пункт, у якога, згодна са знойдзенымі гістарычнымі звесткамі, праз два гады будзе паўтысячагадовы юбілей.**

Трэба ўпарадкаваць не толькі цэнтральныя вуліцы, але і перыферыю горада. Упрыгожыць і абнавіць фасады школ і грамадскіх будынкаў на плошчы, бо гэта — візітка горада. Адміністрацыі раёна і вобласці, якія ўзвалілі на сябе ўсю адказнасць за падрыхтоўку горада да Дня пісьменства, лічаць і спадзяюцца, што сапраўднай візітоўкай гэтага паўднёвага палескага горада стане парк з палацам — унікальным будынкам, які саступае па статнасці і архітэктурнай дасканаласці хіба Гомельскаму палацу Паскевічаў.

У палацы размесціцца музей і выставачная галерэя. У парку ўзводзіцца стадыён з самым сучасным пакрыццём, фантан і амфітэатр.

# ХОЙНІКІ У РЫШТАВАННЯХ



Па словах намесніка старшыні Хойніцкага райвыканкама Віталя Шаўчэнкі, на падрыхтоўку і само свята раёну неабходна асвоіць 85 мільярдаў беларускіх рублёў. Цяпер поўным ходам вядзецца рэканструкцыя аўтастанцыі і чыгуначнага вакзала, будынкаў Цэнтра культуры і пошты, гасцініцы, універмага, ЗАГСа, рынкавай плошчы, узведзены і здаецца шматкватэрны дом у мікрараёне.

Перспектывы, якія калісь адкрываліся Хойнікам, былі перакрэслены ў выніку чарнобыльскай катастрофы. А развал колішняй краіны паставіў наогул тлустую кропку. Тут узводзіліся прадпрыемствы саюзнага значэння, на якіх збіраліся вузлы нават для касмічнай тэхнікі. У тыя часы і быў закладзены мікрараён, які па-мясцоваму атрымаў назву «будоўля». Але жыццё працягваецца. У гадзіну пік і вечаровыя гадзіны на вуліцах «будоўлі» поўна дзяцей і моладзі.

— А колькі б яе было, каб не Чарнобыль і не наступствы перабудовы?! — падказваюць на кожным кроку жыхары гэтага горада ў рыштаваннях.





# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.30 | 21.00 | 15.30 |
| Віцебск — | 5.14 | 20.55 | 15.41 |
| Магілёў — | 5.20 | 20.50 | 15.30 |
| Гомель — | 5.22 | 20.41 | 15.19 |
| Гродна — | 5.46 | 21.15 | 15.29 |
| Брэст — | 5.53 | 21.09 | 15.16 |

## Месяц

*Апошняя квадра 3 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Блізнятаў.*

## Імяніны

*Пр.* Марыі, Трафіма.
*К.* Караліна, Марыі, Освальда, Станіслава.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




## 5 жніўня

### Дзве даты



**1924 год** — пры спробе перайсці дзяржаўную мяжу Савецкага Саюза на тэрыторыі Беларусі быў арыштаваны расійскі палітычны дзеяч, арганізатар шматлікіх тэрактаў Барыс Савінкаў. У 1920-х гадах разам з С. Булак-Булаховічам арганізоўваў рэйды ваенных атрадаў у Савецкую Беларусь з тэрыторыі Польшчы. Свае ўражанні ад Беларусі, становішча сялян і іх настроі адлюстраваў у аповесці «Конь вараны», у якой імкнуўся апраўдаць свой удзел у тэроры.

**1772 год** — адбыўся першы падзел Рэчы Паспалітай паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй. У гэты дзень Расія і Прусія ў Санкт-Пецярбургу была падпісана канвенцыя, паводле якой да Расіі пераходзілі цалкам Мсціслаўскае і Інфлянцкае ваяводствы, усходнія землі Мінскага ваяводства і большая частка Віцебскага і Полацкага ваяводстваў. У адпаведнасці з гэтымі дакументамі Аўстрыя атрымоўвала Галіцыю, Прусія — Памор'е (апроч Гданьска) і частку Вялікай Польшчы.

### Цытата дня:

*«Пакуты кахання нельга перамагчы філасофіяй — можна толькі з дапамогай іншага кахання».*

**Эрых Марыя Рэмарк (1898—1970), нямецкі пісьменнік.**

# СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



Кустоўе, зараснікі
Народ — абарыген Новай Зеландыі
Дзяржанне касы, сякеры, малатка
*** і Джульета (твор У. Шэкспіра)
Польскі парадны танец-шэсце
Паркавы атракцыён
Пятае кола ў аўтамабілі — на ўсялякі выпадак
«Месяц і грош», «Тэатр» (аўтар)
Т.зв. зялёны лімон
Возера ў сістэме Вялікіх азёраў
Буйная крумкачовая птушка
Паэт і спявак уласных песень
Паварот ракі, дарогі
Будучыня, план, віды на будучае
Загарадны дом
Замерзлы луг, поле без снегу
Т.зв. манільская пянька
Сумесь азотнай і сернай кіслот
Індзеец — карэнны жыхар Мексікі
Гераічныя сказанні, песні, легенды
Сталіца Афганістана
Т.зв. пастуховы жураўель
Каштоўны слой ракавіны
Лёгкаатлетычная дысцыпліна
Дэталь струннага муз. інструмента
Калючае пустазелле
Нямілаcць, непрыхільнасць
Геаметрычнае цела ў выглядзе абаранка
Час, тэрмін, перыяд
Музычны інструмент самага нізкага гучання
Частка гульні ў тэніс, валейбол
Балет Андрэя Эшпая
Барацьба японскіх таўстуноў
Шафа ў сучаснай кватэры
Горад-порт у Францыі, на Сене
Несур'ёзная, вясёлая выхадка
Грашовая адзінка ў Латвіі


Сабраныя папярэдне медыкаменты, перавязачныя сродкі, неабходныя інструменты — у салоне аўто, у кватэры, ва ўстанове

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 5 | | 4 | | | | | 2 | 3 |
| | | | | 2 | | | | |
| 7 | 2 | | | | | 1 | | 4 |
| | | | | | 3 | | | |
| | | 3 | 9 | 1 | | 5 | | 8 |
| 9 | | | | 4 | 2 | 3 | | |
| | | 2 | 3 | 9 | | | | 6 |
| 8 | | 6 | | 7 | 1 | 9 | | |
| | | | 6 | | | | | |

**СУДОКУ.** У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клеткі, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

## Факт

### ЛЕЎ З КЛЮЧАМІ

**У цэнтры Ліды, на рагу вуліц Ленінскай і Перамогі «пасяліўся» леў — бронзавы, вышынёй 2,5 метра і вагой каля 750 кілаграмаў. Прычым з ключамі.**

Пасля «Камандзіровачнага» (каля скульптуры «Ліда») і «Лазеншчыка Васі» (ля ўваходу ў лазню) гэта ўжо трэцяя скульптура мінчаніна Уладзіміра Жбанава ў горадзе. На гэты раз — у сааўтарстве з маладым скульптарам Яраславам Філіповічам. Навошта льву ключы? Гэта звязана з геральдыкай Ліды. У 1590 годзе кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт III Ваза даў Лідзе Магдэбургскае права, а таксама герб — шчыт са львом і двума перакрыжаванымі ключамі. Менавіта гэтыя сімвалы выкарыстаны ў сучасным гарадскім гербе.

Мяркуецца, што да рэспубліканскіх «Дажынак» Ліду ўпрыгожыць яшчэ адна праца Уладзіміра Жбанава — мініяцюра «Сноп каласся». У снапе будзе 14 каласоў (14-ы фестываль-кірмаш), апярэзаных беларускім ручніком.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### У МІНСКУ БУДУЦЬ РАЗЛІВАЦЬ ЗНАКАМІТАЕ БАРДО

**ЗАТ «Мінскі завод вінаградных вінаў» першым у Беларусі пачало разліў французскіх вінаў з правінцыі Бардо на ўмовах франчайзінгу. Аб гэтым паведаміў дырэктар прадпрыемства Дзяніс Мароз, перадае БЕЛТА.**

Гэта вядомыя французскія віны з правінцыі Бардо пад гандлёвымі маркамі Chateau Des Chevaliers Bordeaux і Chateau Les Agneras Bordeaux, якія найбольш красамоўна характарызуюць краіну свайго паходжання. Першыя французскія бардоскія віны з Шато ўжо з'явіліся ў беларускіх магазінах. Разліў французскіх вінаў на ўмовах франчайзінгу ажыццяўляецца ў адпаведнасці з кантрактам, падпісаным паміж Домам Рыўер і Мінскім заводам вінаградных вінаў. Падпісанню кантракта папярэднічаў візіт кіраўніцтва Дома Рыўер на Мінскі завод вінаградных вінаў.

Дом Рыўер — адзін са старэйшых вінных гандлёвых дамоў Францыі (утвораны ў 1875 годзе), займаецца вытворчасцю і продажам высакаякасных віна-

# КОНЬ

**Конь** — адзін з найбольш шануемых персанажаў беларускай міфалогіі, вуснапаэтычнай спадчыны і абрадавай практыкі нашага народа. Міфалагічны і казачны **конь** — гэта сімвал часу, вечнасці, непадзельнасці космасу, гэта найбольш надзейны пасрэднік паміж светам жывых і «светам» памерлых, паміж небажыхарамі і людзьмі. Менавіта таму якраз на сівым-белым кані прыязджае на зямлю Юрый і адмыкае «зямліцу», выпускае на свет Божы «расіцу гаючую». Таму ўладальнікі коней асабліва шанавалі гэтага святога.

- Конь надзелены інтуіцыяй і можа прадказваць лёс свайго ўладара. Напрыклад, калі гаспадар збіраўся ў дарогу, а ўжо запрэжаны конь пачаў фыркаць або біць зямлю капытамі, то гэта ўспрымалася нядобрым знакам. У такім выпадку паездку маглі перанесці на іншы час.
- Па паводзінах каня маглі прадказваць стан надвор'я:
  — конь часта фыркае — да хуткага дажджу;
  — конь храпе або закідвае галаву ўверх — будзе непагадзь.
- Асаблівай павагай карыстаўся **конь** у абрадавай практыцы беларусаў, перш за ўсё на вяселлі і пахаванні. Вясельнага каня ўпрыгожвалі рознакаляровымі стужкамі, кветкамі, да дугі мацавалі званочкі, а на шыю надзявалі шархуны, якія павінны былі адганяць нячыстую сілу і даваць знак аднавяскоўцам аб прыбліжэнні вясельнага поезда.
- Існавала дакладнае размежаванне ў выкарыстанні **коней** у розных абрадах. Так, каня, на якім везлі нябожчыка, ніколі не будуць выкарыстоўваць у вясельным поездзе.
- Разам з тым у адной з легендаў расказваецца пра тое, што Бог пракляў гэту жывёліну: «Пасля нараджэння Багародзіца палажыла нованароджанага ў яслі і прыкрыла сенам, каб схаваць ад ваяроў цара Ірада. Вол, які стаяў побач, перастаў есці, а **конь** працягваў есці і тым самым «раскрываў» месца паратунку Хрыста. Таму Бог пракляў каня і сказаў: «Ты будзеш заўсёды есці і ніколі не наясіся», а вала благаславіў і сказаў, што яго мяса людзі будуць выкарыстоўваць у харчаванні».

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

*З днём нараджэння віншуем* **Грыба Дзмітрыя Георгіевіча** *з в. Беражцы Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.*
*Жадаем вялікага сямейнага шчасця, моцнага здароўя, дабрабыту, поспеху ў рабоце.*
**Цесць Міхаіл, цешча Лідзія, жонка Юля і цётка Ала.**

## Усміхнемся!

**Гідраметцэнтр абяцае заўтра рэзкае пахаладанне да +30...**

☺

— Галечка, мы да вас зойдзем з Вольгай?
— На чай?
— На кандыцыянер!..

☺

**Палюбоўнік лепш за мужа! Ды і есць ён радзей...**

☺

Сяброўка тэлефануе:
— Алё, Таня, ты дома?
— Так!
— Нафарбаваная?
— Не!
— Тады выходзь хутчэй, а то да мяне ў двары нейкія хуліганы прычапіліся!

☺

**З характарыстыкі:**
**...не ўмее карыстацца сакратаркай...**

☺

**Гарэлка канчаецца не тады, калі канчаюцца грошы, а тады, калі канчаюцца здольныя за ёй збегаць.**




ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 3785. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12